Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК і МЕНСКАГА АБКОМА КП(б)Б

№ 134 (6411) | 14 чэрвеня 1939 г., серада | ЦАНА 10 КАП.

Пытанне аб абароне трох балтыйскіх краін ад агрэсіі

Водгукі ў замежным друку на вядомае выступленне тав. Молатава ў Вярхоўным Совеце СССР усё яшчэ прадаўжаюцца. Найбольш энергічна і шырока каментыруецца тая частка выступлення т. Молатава, дзе гаварылася аб дапамозе Англіі, Францыі і СССР тром балтыйскім краінам — Эстоніі, Латвіі і Фінляндыі супроць агрэсіі, калі гэтыя краіны акажуцца не ў сілах адстаяць свой нейтралітэт.

Першы час некаторыя дзеячы замежнай прэсы лічылі пытанне аб трох балтыйскіх краінах пытаннем надуманым, штучна прыцягнутым за валасы для нейкіх невядомых мэт. Цяпер, аднак, яны вымушаны прызнаць, што такая ацэнка няправільна, што пытанне аб захаванні нейтралітэта трох балтыйскіх краін прадстаўляе жыццёвы інтарэс з пункту погляду безапаснасці Совецкага Саюза.

Другія пярэчылі, што калі Совецкі Саюз і зацікаўлен у пытанні аб трох балтыйскіх краінах, то для Францыі і Англіі гэтае пытанне не мае ніякага актуальнага значэння. Аднак, хутка павінны былі прызнаць няправільнасць і гэтага пярэчання. У ходзе дыскусіі стала відавочна, што ў захаванні нейтралітэта трох балтыйскіх краін Францыя і Англія зацікаўлены не менш Совецкага Саюза. Нават такі палітычны дзеяч, як англійскі кансерватар Чэрчыль, прымушан прызнаць першаступеннае значэнне гэтага пытання для Францыі і Англіі. Выказваючыся за гарантыі Латвіі, Эстоніі і Фінляндыі, Чэрчыль гаворыць:

«Не падлягае сумненню, што калі-б гэтыя краіны падвергліся ўзарванню немцаў ці былі-б узарваны знутры фашысцкай прапагандай і інтрыгамі, то ўся Еўропа была-б уцягнута ў вайну... Калі іх незалежнасць або цэласнасць падвергнецца пагрозе з боку германскіх фашыстаў, Польшча павінна біцца, Вялікабрытанія і Францыя павінны біцца, СССР павінен біцца».

Але прызнаючы ў прынцыпе правільнасць вядомага тэзіса т. Молатава аб дапамозе тром прыбалтыйскім краінам, значная частка дзеячоў замежнага друку не рашаецца зрабіць з гэтага адпаведны практычны вывад з тройственай гарантыі нейтралітэта гэтых краін.

Адны гаворыць, што такая гарантыя не ў інтарэсах Эстоніі, Латвіі і Фінляндыі, што народы гэтых краін не адчуваюць патрэбы ў дапамозе звонку, што яны самі могуць з поспехам адстаяць сваю незалежнасць супроць любой агрэсіі. Гэта, вядома, няправільна, калі не сказаць больш. Калі нават такая дзяржава, як Чэхаславакія, якая мела ўдвая больш насельніцтва і армії, чым усе тры балтыйскія краіны разам узятыя, будучы прадастаўлена сабе самой, не змагла адстаяць сябе супроць агрэсіі, то якая падстава меркаваць, што тры невялікія балтыйскія дзяржавы здольны на большае, чым Чэхаславакія, і не адчуваюць патрэбы ў дапамозе з боку іншых дзяржаў? Не можа быць сумненняў, што народы трох балтыйскіх краін кроўна зацікаўлены ў гарантыі іх незалежнасці з боку вялікіх міралюбівых дзяржаў.

Другія гаворыць, што прынцыпе дапамогі вялікіх дзяржаў трыма прыбалтыйскімі краінамі азначала-б для іх страту суверэнітэта, утрату незалежнасці. Гэта, вядома, бязглуздзіца. Усе міралюбівыя дзяржавы шукаюць дапамогі адзін у аднаго супроць агрэсіі. Англія мае гарантаваную дапамогу з боку Францыі, Польшчы, Турцыі. Усе гэтыя краіны, у сваю чаргу, маюць гарантаваную дапамогу з боку Англіі. Мы ўжо не гаворым аб Бельгіі, нейтралітэт якой гарантаван Англіяй і Францыяй, роўна як аб Румыніі і Грэцыі, незалежнасць якіх гарантавана Англіяй. Ці азначае гэта, што ўказаныя краіны, атрымаўшы гарантыі звонку, страцілі тым самым суверэнітэт і пазбавіліся сваёй незалежнасці? Варта толькі ясна паставіць гэтае пытанне, каб зразумець усю недарэчнасць падобнага пярэчання.

Нарэшце, некаторыя дзеячы англа-французскай прэсы гаворыць аб тым, што афіцыяльныя прадстаўнікі трох балтыйскіх краін адмаўляюцца атрымаць дапамогу з боку міралюбівых дзяржаў, што яны не хочуць такой дапамогі, і што з прычыны гэтага нельга навязваць гэтым краінам дапамогу міралюбівых дзяржаў. Да гэтага пярэчання прыбягаюць, як вядома, таксама міністр замежных спраў Эстоніі Сельтэр і міністр замежных спраў Фінляндыі Эрко. Нам здаецца, што мы маем тут справу або з непаразуменнем, або з дрэнна скрытым жаданнем некаторых палітычных дзеячоў сарваць справу стварэння абарончага фронта міралюбівых дзяржаў супроць агрэсіі.

Мы ўжо гаварылі вышэй, што народы Эстоніі, Латвіі і Фінляндыі кроўна зацікаўлены ў тым, каб міралюбівыя дзяржавы прышлі да іх на дапамогу ў выпадку прамога ці ўскоснага нападу агрэсара. Гэта такая самавідавочная ісціна, якую пялоўка нават даказваць. Чым-жа ў такім выпадку аб'ясніць адмаўленне паноў Сельтэра і Эрко ад дапамогі міралюбівых дзяржаў? Магчыма, што гэта можна было-б аб'ясніць некаторай недаацэнкай пагрозы агрэсіі з боку гэтых палітычных дзеячоў. З падобнай недаацэнкай мы мелі нядаўна справу ў адносінах Румыніі і Польшчы, некаторыя прадстаўнікі якіх пярэчылі, як супроць гарантыі ў адносінах гэтых краін з боку Совецкага Саюза, так і, як нам паведамлялі, супроць заключэння пакта ўзаемадапамогі паміж Англіяй, Францыяй і СССР. Аднак, акалічнасці ў далейшым прывялі к таму, што гэтыя пярэчанні былі зняты. Не выключана, што тое-ж самае можа мець месца ў бліжэйшым будучым і ў адносінах некаторых прадстаўнікоў трох балтыйскіх краін. А гэта не выключана, як таму, што пагроза агрэсіі становіцца ўсё больш яснай і відавочнай, аб чым можна было-б многа павучальнага пачэрпнуць з вядомага паслання прэзідэнта ЗША Рузвельта, так і таму, што карэнныя інтарэсы трох балтыйскіх краін, якія патрабуюць дапамогі супроць агрэсіі з боку міралюбівых краін, будуць сказвацца ўсё мацней і мацней.

Але магчыма і другое аб'яснене паводзін памянёных вышэй палітычных дзеячоў Эстоніі і Фінляндыі. Зусім магчыма, што мы маем тут справу з поўнымі ўплывамі звонку, калі не з прамой інспіраціяй з боку тых, якія хочуць перашкодзіць справе стварэння шырокага абарончага фронта супроць агрэсіі. У даны момант пяжка сказаць, хто іменна з'яўляюцца тут сапраўднымі натхніцелямі: агрэсіўныя дзяржавы, зацікаўленыя ў зрыве антыагрэсарскага фронта, або некаторыя рэакцыйныя кругі дэмакратычных дзяржаў, якія імкнуцца абмежаваць агрэсію ў адных раёнах, не перашкаджаючы развязванню яе ў другіх раёнах.

Характэрна, што нават такі правы французскі буржуазны журналіст, як Анры дэ Керыліс, лічыць такое меркаванне найбольш праўдападобным. Вось што ён піша ў газеце «Эпок»:

«У адносінах гарантый балтыйскім краінам патрабаванні Совецкага Саюза абсалютна законны і зусім лагічны. Калі Францыя і Англія ўступаюць у пагадненне з Совецкім Саюзам, яны павінны быць зацікаўлены ў тым, каб Совецкі Саюз не папярнеў у першыя-ж дні вайны ад германскай інтэрвенцыі праз тэрыторыю балтыйскіх краін. Трэба, каб мы ведалі, да чаго-ж мы імкнемся: хочам мы ці не хочам заключыць саюз з СССР?.. Калі мы хочам гэтага саюза, мы павінны зрабіць усё, каб Германія не абаснавалася ў Рызе, Таліне і Хельсінкі, а таксама на Аландскіх астравах. Указваюць, што ні Фінляндыя, ні Эстонія, ні Латвія не жадаюць франка-англа-совецкіх гарантый. Што за чартаўшчына? Калі яны не жадаюць гэтых гарантый, то гэта значыць, што ёсць лішнія падставы для неспакою. Указаныя балтыйскія краіны, дзве з якіх з'яўляюцца краінамі-ліліпутамі, не здольны самі забяспечыць сваю незалежнасць. І калі яны спрыяжаюць адваротнае, то гэта значыць, што яны ўступілі ў германскую арбіту. Совецкі Саюз жадае гэтаму пропісташь. Мы павінны паступіць гэтак-жа».

Выходзіць, такім чынам, што апошняе пярэчанне супроць вядомага тэзіса ў дакладзе т. Молатава аб абароне трох прыбалтыйскіх краін супроць агрэсіі таксама пазбаўлена падставы з пункту погляду інтарэсаў антыагрэсарскага фронта міралюбівых дзяржаў, як і папярэднія пярэчанні.

Са сказанага вынікае, што пазіцыя Совецкага Саюза ў пытанні аб абароне трох балтыйскіх краін ад агрэсіі з'яўляецца адзіна правільнай пазіцыяй, зусім адпавядаючай інтарэсам усіх міралюбівых краін, у тым ліку інтарэсам Эстоніі, Латвіі і Фінляндыі.

(Перадавы артыкул «Правды» ад 13 чэрвеня 1939 г.).

РЭКОРД СТАХАНАЎЦА тав. БАРАВІКА

ПРЫВІТАННЕ НАРКОМА тав. МАЛЫШЭВА

КІЕЎ, 9 чэрвеня. (ТАСС). У чэсць першай гадавіны выбара у Вярхоўны Совет Украіны свідравальшчык-стахановец кіеўскага завода станкоў-аўтаматаў ім. Горкага тав. Баравік устанавіў выдатны рэкорд прадукцыйнасці працы. Вырабіўшы спецыяльны штамп, ён рацыяналізаваў працэс насечкі ноніуса (дзяленняў) у рэгуляровачным вінце для пралольных і папярэчных супартаў. Па тэхнічнай норме на апрацоўку аднаго вінта патрабуецца 57 мінут. Учора, працуючы пры дапамозе свайго прыстасавання, тав. Баравік за 5 мінут зрабіў насечку на 41 дэталі, выканаўшы норму на 46 тысяч процантаў. Замест 57 мінут ён апрацоўваў кожную дэталь 7,2 секунды.

Сёння нарком цяжкага машынабудаўніцтва СССР тав. В. М. Малышэў паслаў тав. Баравіку наступную тэлеграму:

«Віншую Вас з выдатным поспехам у справе рацыяналізацыі і дасягнення высокай прадукцыйнасці працы. Упэўнен, што Ваш прыклад будзе падхоплен стахановамі і рацыяналізатарамі нашых заводаў. Узнагароджваю Вас імянным гадзіннікам».



На сходзе партыйнага актыва Менскай гарадской арганізацыі КП(б)Б, прысвечаным вынікам майскага Пленума ЦК ВКП(б). Фото В. А. Вернера (Фотахроніка БЕЛТА).

СХОД ПАРТЫЙНАГА АКТЫВА г. МЕНСКА

Учора ў Вялікай зале Дома ўрада адкрыўся сход менскага гарадскога партыйнага актыва, прысвечаны вынікам майскага Пленума ЦК ВКП(б) і чэрвеньскага Пленума ЦК КП(б)Б. На сходзе прысутнічала 1500 чалавек.

Пад бурныя, доўга не змаўкаючыя апладысменты сход аднадушна выбраў пачотны прэзідыум у саставе таварышаў Сталіна, Молатава, Варашылава, Л. М. Кагановіча, Калініна, Андрэева, Мікаяна, Жданава, Хрушчова, Берыя, Шверніка, Дзімітрава, Тэльмана, Хозе Дыяс і Даларэс Ібаруры.

Старшынствуючы сакратар Менскага абкома і гаркома партыі тав. Матвееў прадастаўляе слова для даклада аб выніках майскага Пленума ЦК ВКП(б) сакратару ЦК КП(б)Б таварышу Панамарэнка.

Тав. Панамарэнка падрабязна спыняецца на пытанні аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання. Ён гаворыць аб гістарычным значэнні рашэння Пленума ЦК ВКП(б), якое мае велізарнае значэнне ў справе далейшага ўмацавання калгаснага ладу.

— ЦК ВКП(б), — гаворыць тав. Панамарэнка, — ускрыў грубейшыя нарушэнні статута сельскагаспадарчай арцелі, факты разбазарвання калгасных зямель. Справа ідзе, гаворыць ён, аб ліквідацыі сур'ёзных скажэнняў палітыкі партыі ў галіне калгаснага землекарыстання.

Тав. Панамарэнка прыводзіць рад фактаў, якія гавораць аб тым, што і ў Беларусі маюць месца грубейшыя нарушэнні статута сельгасарцелі. Ёсць нямала выпадкаў незаконнага павелічэння прысядзібных участкаў пад повадам мнімых разлёлаў, захватаў і т. д. У радзе месц справа даходзіла да таго, што калгасную зямлю раздавалі ў якасці прэмій. «Указаныя вышэй і ім падобныя грубейшыя скажэнні статута сельскагаспадарчай арцелі атрымалі шырокае распаўсюджанне толькі таму, што партыйныя і совецкія кіраўнікі, замест штодзённага выхавання калгасаў і калгаснікаў у духу строгага захавання калгаснага ладу, самі спрыяюць сваёй анартуністычнай практыкай нарушэнню статута і злачынна-благадушна адносяцца да пранікнення ў калгасы варожых калгаснаму ладу прыватнаўласніцкіх, буржуазных тэндэнцый, занасімых астаткамі разбітага кулацтва».

ЦК ВКП(б) яшчэ ў снежні мінулага года рашуча папярэджваў нашу партыйную арганізацыю аб наяўнасці фактаў нарушэння статута сельгасарцелі. Аднак, указанне ЦК партыі партыйнымі арганізацыямі поўнасцю не выканана.

Дакладчык падкрэслівае, што асноўнай формай калгаснага ладу з'яўляецца сельгасарцель. Яна базіруецца на правільным спалучэнні інтарэсаў грамадскай гаспадаркі калгаса з асабістымі інтарэсамі калгасніка. Грамадская гаспадарка — гэта аснова калгаснага ладу: іменна на аснове правільнага спалучэння інтарэсаў грамадскай гаспадаркі калгаса з асабістымі інтарэсамі калгаснікаў адбываецца ўмацаванне калгаса.

Тав. Панамарэнка гаворыць, што сіла і моцнасць калгаснага ладу грунтуецца на тым, што пераважная большасць калгаснікаў працуе чесна, акуратна, добрасумленна, выконваючы свой доўг і абавязкі перад калгасамі і на гэтай аснове палепшаюць свой добрабыт. З года ў год расце прадукцыйнасць працы. Гэта ярка відаць на такім прыкладзе. У 1938 годзе лік калгаснікаў, выпрацаваўшых звыш 400 працадзён, павялічыўся ў параўнанні з 1937 годам на 10,8 проц., а лік калгаснікаў, якія не прымалі ўдзел у калгаснай працы, зменшыўся супроць 1937 года на 20 процантаў.

— Але ёсць яшчэ людзі, — гаворыць тав. Панамарэнка, — якія ігнаруюць грамадскія парадкі, людзі, якія прабуюць прыстасаваць грамадскія парадкі калгаса да мэт сваёй асабістай нажывы, спекуляцыі, яны не працуюць у калгасе, прыкрываючыся шырмай калгасніка. Яны, гэтыя дармаеды, сядзяць на шыі ў калгаса і прабуюць яго аслабіць. Таму зусім правільна ўказана ў пастанове ЦК ВКП(б) і СНК СССР, што працаздольныя калгаснікі і калгаснікі, не выпрацаваўшыя на працягу года мінімума працадзён, павінны лічыцца выбыўшымі з калгаса і страціўшымі права калгаснікаў.

Пастанова ЦК ВКП(б) і СНК СССР «Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання» выклікала велізарны палітычны ўздым сярод калгасных мас. На калгасных сходах пераважная большасць калгаснікаў поўнасцю і аднадушна адабрае пастанову партыі і ўрада. Калгаснікі апалчыліся супроць посьбітаў рвацкіх тэндэнцый і прыступілі ўжо да навядзення большэвіцкага парадку ў калгасах.

Наяўнасць гаспадарак, пражываючых на былых участках хутарскога землекарыстання, тармозіць далейшае развіццё калгаснага ладу, перашкаджае ўвядзенню правільных севаабаротаў, спрыяе падрыву працоўнай дысцыпліны, аднімае многа калгаснай зямлі пад дарогі, што ідуць да хутароў, выклікае нарушэнні статута сельгасарцелі.

Перад намі стаіць велізарная задача — сяляніць хутарскія гаспадаркі ў калгасныя сяленні ў тэрміны, указаныя партыяй і ўрадам.

Зараз у раёнах рэспублікі, пасля майскага Пленума ЦК ВКП(б) і чэрвеньскага пленума ЦК КП(б) Беларусі, разгарнулася вялікая работа па сяленню хутароў. Толькі за апошнія 4—5 дзён чэрвеня сселена 9.300 хутароў у калгасныя сяленні.

Тав. Панамарэнка заклікае партыйныя і совецкія арганізацыі забяспечыць правільнае планаванне калгасных сяленняў; ён перасцерагае ад небяспекі насаджэння кармікавых сяленняў, распылення калгасных сяленняў па брыгадах. Тав. Панамарэнка ўказвае на неабходнасць праяўлення клопатаў аб упарадкаванні не толькі ўсяго калгаснага сялення, але і кожнага дома калгасніка. Нельга мірыцца з такім становішчам, заўважае ён, калі дом перавязуць, а вось пэцла для печкі адсутнічае.

Тав. Панамарэнка ставіць перад Менскай гарадской партыйнай арганізацыяй задачу — аказаць у сяленні хутароў усямерную дапамогу калгасам і, у першую чаргу, кадрамі тэхнікаў і дзесятнікаў-будаўнікоў.

Задача партыйных арганізацый нашай рэспублікі — па-большэвіцку выкараніць скажэнні статута сельгасарцелі, навесці парадак у калгасным землекарыстанні. Неабходна давесці да сазнання калгаснікаў пастанову ЦК ВКП(б) і СНК СССР, расказаць ім аб клопатах і ўвазе, якія праяўляе партыя Леніна—Сталіна да калгаснікаў.

Далей тав. Панамарэнка спыняецца на задачах падрыхтоўкі да ўборкі ўраджаю і загатовак сельгаспрадуктаў. У гэтым годзе веснавая сяўба была праведзена больш арганізавана, чым у мінулым годзе. Калгасы чакаюць багатых ўраджаяў. Партыйным, совецкім і зямельным арганізацыям трэба неадкладна выправіць усе наяўныя недахопы ў справе падрыхтоўкі да ўборкі ўраджаю, своечасова адрамантаваць камбайны і іншы ўборачны інвентар, правільна расставіць рабочую сілу. Трэба закончыць падрыхтоўку механізатарскіх і іншых кадраў да ўборкі ўраджаю.

Тав. Панамарэнка звяртае асаблівую ўвагу партарганізацый на неабходнасць правільнай арганізацыі справы аднясення калгасаў да разрадаў ураджайнасці для налічэння натураплаты. Ён гаворыць, што трэба аказаць дапамогу загатоўчым арганізацыям у правядзенні загатовак у 1939 годзе. Асабліва адзначае аб спыненні ўсякіх антыдзяржаўных спроб, накіраваных на заніжэнне ўраджайнасці ў калгасах і тым самым штучнае зніжэнне натураплаты. Неабходна таксама звярнуць сур'ёзную ўвагу на арганізацыю абмалоту і бесперабойную здачу зярна дзяржаве.

У сваім дакладзе тав. Панамарэнка асвятліў таксама рашэнне ЦК ВКП(б) аб надыходзячых выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Ён гаворыць, што партарганізацыі прадстаўць вялікая работа па разгортванню палітыка-масавай работы сярод працоўных.

Далей тав. Панамарэнка паведамляе аб рашэннях, прынятых чэрвеньскім пленумам ЦК КП(б)Б, аб нарушэнні некаторымі пярвічнымі партыйнымі арганізацыямі і райкомамі КП(б) Беларусі ленінска-сталінскага прынцыпа індывідуальнага адбору ў партыю. Пасля XVIII з'езда ўзмацнілася пята перадавых людзей у партыю. Толькі за апошнія 5 месяцаў прынята ў КП(б)Б 14.058 чалавек. Сярод прынятых — перадавыя стаханаўцы прамысловасці, сельскай гаспадаркі, інжынеры, прафесары, пастаўнікі, комсамольцы.

Аднак, некаторыя мясцовыя партыйныя арганізацыі сталі на няправільны шлях, і ЦК КП(б)Б мае факты, якія сведчаць аб наяўнасці сур'ёзных нарушэнняў ленінска-сталінскага прынцыпа індывідуальнага адбору ў партыю, дапускаемых радам партыйных арганізацый: так, Чэрвеньскі райком партыі, сказіўшы ўказанні XVIII з'езда ВКП(б), дапусціў у асобных партыйных арганізацыях групавую вярбоўку ў рады партыі, устанавіў кантрольную лічбу па прыёму. Прысутныя ў час гутарак запрашаліся ўступаць у партыю. Школная спешка пры прыёме ў партыю, імкненне шырока адчыніць дзверы для ўсіх жадаючых назіралася і ў цэлым радзе іншых раённых партарганізацый.

— Адною з асноўных задач далейшага ўмацавання партыі, — гаворыць тав. Панамарэнка, — з'яўляецца строгае захаванне ўказання таварыша Сталіна аб тым, што мы павінны «сістэматычна папаўняць састаў партыі, падымаючы ўзровень свядомасці членаў партыі і прымаючы ў рады партыі ў парадку індывідуальнага адбору толькі праверэных і адданых справе комунізма, таварышаў».

Заканчваючы свой даклад, тав. Панамарэнка гаворыць, што праходзячыя пленумы, партыйныя сходы і актывы аднадушна адабраюць рашэнні майскага Пленума ЦК ВКП(б) і намячаюць практычныя мерапрыемствы па іх поўнаму выкананню. Няма сумнення ў тым, што большэвікі Беларусі з задачамі, пастаўленымі перад імі ЦК ВКП(б), вялікім Сталіным, справяцца з чэсцю.

Пасля даклада тав. Панамарэнка разгарнуліся спрэчкі. Першым выступіў сакратар Варашылаўскага горкома КП(б)Б тав. Столін.

— Гістарычная пастанова ЦК ВКП(б) і СНК СССР «Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання», — заявіў ён, — мае велізарнае палітычнае значэнне для далейшага прасоўвання нашай краіны да комуністычнага грамадства.

На прыкладзе калгаснага землекарыстання Сталінскі Цэнтральны Камітэт вучыць партыю, партыйных і совецкіх кіраўнікоў не толькі бачыць, але і папярэджваць развіццё тэндэнцый, якія могуць пашкодзіць калгаснаму ладу, інтарэсам нашага народа.

Пастанова Цэнтральнага Камітэта — прыклад марксісцка-ленінскага прадбачання, яна папярэджвае развіццё дробнаўласніцкіх тэндэнцый і аблягчае далейшае ўмацаванне сацыялістычнага земляробства.

Тав. Столін гаворыць аб тым, як партарганізацыя Варашылаўскага раёна ўзялася за ажыццяўленне рашэнняў майскага Пленума ЦК ВКП(б). У сельскія раёны вобласці пасланы 22 тэхнікі, 8 будаўнічых брыгад, аўтамашыны.

Мы маем усе магчымасці, — заяўляе ён, — дапамагчы сельскім раёнам не толькі людзьмі, але і мабілізацыяй унутраных рэсурсаў нашых прадпрыемстваў. У прамысловай арцелі «Чырвоны металіст» мы правялі сход, і калектыў абавязаўся выпрацаваць звыш плана на патрэбы ссялення хутароў 3 тоны цвікоў, дзвярныя ручкі, завесы і т. д.

Аб задачах партыйных і совецкіх арганізацый у падрыхтоўцы да пасяхованага правядзення ўборачнай кампаніі гаварыў у сваім выступленні тав. Букацін (чытаўнаважаны Наркамата загатовак па Менскай вобласці).

Аб геніяльнай празорлівасці вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна, Сталінскага Цэнтральнага Камітэта гаварыў тав. Урсулаў (Акадэмія навук).

— Наша калгаснае сялянства, маючае перадавую тэхніку, з года ў год множыць перамогі сацыялістычнага земляробства, будуе сваё культурнае, шчаслівае, заможнае жыццё. У гэтым годзе многія калгасы нашай рэспублікі будуць адзначаць дзесяцігоддзе свайго існавання.

Пастанова ЦК ВКП(б) і СНК СССР ёсць далейшае праяўленне сталінскіх клопатаў аб працвітанні і ўмацаванні калгаснага ладу, аб надзенных інтарэсах калгаснікаў.

— Вось чаму, — заяўляе тав. Урсулаў, — калгаснае сялянства з найвялікшым адабрэннем і энтузіязмам сустрэла гэтую выдатную пастанову.

— Ад партыйных арганізацый, — прадаўжае ён, — зараз патрабуецца дарэсці гэтую гістарычную пастанову да сазнання кожнага калгасніка, пяспынна выхоўваючы ў калгаснікаў пачуццё неабходнасці няўхільнага выканання статута сельгасарцелі.

Сёння сход прадаўжае сваю работу.

СВЯТА Ў ВЫШЭЙШЫМ ВАЕННА-МАРСКІМ ІНЖЫНЕРНЫМ ВУЧЫЛІШЧЫ імені Ф. Э. ДЗЕРЖЫНСКАГА

ЛЕНІНГРАД, 11 чэрвеня. (ТАСС). Раласным днём было 11 чэрвеня для курсантаў, камандзіраў, палітработнікаў і выкладчыкаў Вышэйшага Ваенна-Марскога інжынернага вучылішча імені Ф. Э. Дзержынскага.

Да свайго свята — дваццацігадовага юбілею—вучылішча атрымала высокую ўзнагароду — ордэн Леніна.

На свята прыбылі камандуючы Чырвонасцяжным Балтыйскім Флотам флагман 2-га ранга тав. Трыбуц, член Ваеннага Совета Балтыйскага Флота тав. Мураўёў. Яны абходзяць рады маладых камандзіраў, інжынераў і курсантаў. Камандуючы віншуе дзержынцаў. Затым аглашаецца загад наркома Ваенна-Марскога Флота СССР аб чарговым выпуску. Новым караблебудаўнікам, механікам і электрыкам прысвойваецца званне ваентэхнікаў 1-га ранга.

Ваенком вучылішча тав. Дземідаў зачытвае Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб узнагароджанні вучылішча імені Ф. Э. Дзержынскага ордэнам Леніна.

Вечарам адбылося ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае юбілею.

СЫТВОРЧАЯ ПЕРАМОГА БАБРУЙСКАГА ЛЕСАКАМБІНАТА

Рабочы калектыў Бабруйскага лесакамбіната дабіўся новай перамогі. 11 чэрвеня прадпрыемства датэрмінова выканала поўгадовую вытворчую праграму. Выпушчана прадукцыі на 7 млн. 781 тыс. руб. — 100,1 проц. плана.

Дырэктар камбіната КУЗНЯЦОЎ.
Сакратар парткома ГРАЙФЕР.
Старшыня заўкома ГРЫНШТЭЙН.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ АЛІМПІЯДА МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ ПРОМКААПЕРАЦЫІ

Учора ў менскім клубе імені Сталіна адкрылася 4-я ўсебеларуская алімпіяда мастацкай самадзейнасці арцелей сістэмы Белкаапромсовета. Алімпіяда прадоўжыцца 4 дні. У ёй прымуць удзел 800 работнікаў промкааперацыі 30 гарадоў і раёнаў БССР. Лепшыя, таленавітыя прадстаўнікі мастацкай самадзейнасці прадэманструюць свае поспехі ў развіцці самадзейнага мастацтва.

Праграма першага паказу пачалася выступленнем зводнага хора, які выканаў «Песню аб Сталіне». Затым выступілі з выкананнем беларускіх народных танцаў «Лявоніха», «Мяцеліца» і інш. калектывы торфарцелей імені Сталіна, Смалявіцкага раёна, і імені 16-ці чырвоных партызан (Рудзенскі раён). Хор веткаўскай вяровачнай арцелі «Пролетарый» добра праспяваў беларускія народныя песні. Асаблівы поспех атрымалі танцавальныя калектывы барысаўскага клуба промкааперацыі (выкананне малдаўскага танца) і гомельскай шавецкай арцелі «Кааперпуць» (руская пляска).

Танцораў змяняюць спевакі, музыканты, дэкламатары. У кожным выступленні адчуваецца моладасць, свежасць, задор, радасць шчаслівага жыцця совецкага народа. У сваіх песнях і частушках таленавітыя прадстаўнікі народа славяць партыю большэвікоў і любімага правадыра—таварыша Сталіна.

Першыя выступленні паказваюць значны культурны і творчы рост калектываў мастацкай самадзейнасці.

Лепшыя выканаўцы будуць адабраны для ўдзелу ва ўсесаюзнай алімпіядзе мастацкай самадзейнасці промкааперацыі, якая адбудзецца ў ліпені ў Маскве. Яны там выступяць з выкананнем літаратурна-музыкальнага мантажа на тэму «Ордэнаносная квітнеючая Беларусь». Музыку піша кампазітар тав. Палонскі. **Н. Г.**

НА РАЁННЫХ ПАРТЫЙНЫХ СХОДАХ І ПЛЕНУМАХ РК КП(б)Б

МАГІЛЕЎ

10 чэрвеня адбыўся сход Магілеўскай сельскай райпартарганізацыі, прысвечаны вынікам майскага пленума ЦК ВКП(б) і чэрвеньскага пленума ЦК КП(б)Б. На сходзе прысутнічала 350 комуністаў. З дакладам аб рэалізацыі рашэнняў пленума выступіў член бюро РК КП(б)Б, — старшыня РВК тав. Турык.

Тав. Турык падрабязна спыніўся на пытанні аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання, аб ходзе ссялення калгаснікаў у калгасныя паселішчы.

Па дакладу разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі. Усяго выступіла 19 чалавек. Таварышы аднадушна падкрэслівалі, што пастанова партыі і ўрада накіравана на ўмацаванне калгаснага ладу, на яшчэ больш росквіт заможнага і культурнага жыцця калгаснікаў. Тав. Пахомаў (сакратар первічнай партарганізацыі) расказаў аб велізарным палітычным і вытворчым уздыме, з якім калгаснікі абмяркоўваюць пастанову ЦК ВКП(б) і СНК СССР «Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання».

— На 11 чэрвеня, — гаворыць тав. Пахомаў, — па Пашкаўскаму сельсавету сселена з хутароў 91 гаспадарка. Комуністы абавязаліся скончыць ссяленне калгаснікаў да дня 19 гадавіны вызвалення Беларусі ад белапалякаў.

Тав. Таборка (старшыня калгаса «Комінтэрн») гаварыў аб тым, што ў калгасе створана 5 плотніцкіх звенняў, за імі замацована 20 коней. Калгас абавязаўся астаўшыяся 32 хутарскія гаспадаркі ссяліць на працягу чэрвеня месяца.

У спрэчках выступілі тт. Сіротка (сакратар РК КП(б)Б), Удоўскі (загатчык райза), Філіпаў (інструктар РК КП(б)Б) і іншыя.

На сходзе з прамовай выступіў сакратар Магілеўскага абкома КП(б)Б тав. Ігаеў.

У прынятай рэзалюцыі сход аднадушна адобрыў рашэнні пленумаў ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б і намеціў практычныя мерапрыемствы па рэалізацыі пастановы ЦК ВКП(б) і СНК СССР «Аб ахове грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання», а таксама падрыхтоўцы і правядзенню ўборкі ўраджаю і выкананню хлебазагатовак.

Для шырокага раз'яснення пастаноў партыі і ўрада райком партыі накіраваў у калгасы 82 комуністаў.

М. ШЫКУН.

СІРОЦІНА

10 чэрвеня адбыўся раённы партыйны сход, прысвечаны вынікам майскага пленума ЦК ВКП(б) і чэрвеньскага пленума ЦК КП(б)Б. На сходзе прысутнічала 218 членаў і кандыдатаў партыі. З дакладам выступіў сакратар райкома партыі тав. Сускін.

— Партыя і совецкі ўрад, — гаворыць т. Сускін, — праяўляюць велізарныя клопаты аб працвітанні калгаснага ладу. Яркім сведчаннем гэтаму — пастанова ЦК ВКП(б) і СНК СССР «Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання». Пастанова адыгрывае велізарную ролю ў далейшым арганізацыйным умацаванні калгасаў, яна з'яўляецца дакументам, які поўны сталінскіх клопатаў аб росквіце заможнага і культурнага калгаснага жыцця.

Пасля даклада разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі. У сваім выступленні т. Саўчанка сказаў:

— З велізарным задавальненнем сустрэлі калгаснікі пастанову ЦК ВКП(б) і СНК СССР «Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання». Пераважная большасць калгаснікаў нашага раёна працуе чэсна і самааддана, усямерна ўмацоўваючы калгасны лад. Толькі ў рэзультаце нарушэння статута сельскагаспадарчай арцелі з'явіліся мнімыя калгаснікі, якія карыстаюцца ўсімі правамі калгаса, нічога агульнага не маючы з калгаснай вытворчасцю.

Выступіўшы ў спрэчках тав. Іваноў гаварыў аб велізарным палітычным і вытворчым уздыме, з якім калгаснікі сустрэлі пастанову партыі і ўрада.

— Ссяленне хутароў у калгасныя цэнтры, — гаворыць т. Колцін, — мае велізарнае палітычнае значэнне. Калгаснікі з задавальненнем хочуць раз назаўсёды пакончыць з хутарскімі сядзібамі. Так, у калгасе «Сянькова», Жарабыцкага сельсовета, 12 сямей ударнымі тэмпамі пачалі перавозіць свае будынкі ў калгасныя цэнтры. Калгаснікі дабіваюцца таго, каб у 1939 годзе ссяліць усе хутары.

Усяго ў спрэчках выступіла 14 таварышоў.

Раённы партыйны сход прыняў рэзалюцыю, у якой аднадушна адобрыў рашэнні пленумаў ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б.

С. КАРОТКІ, А. ПОЗНЯК.

БРАГІН

11 чэрвеня адбыўся раённы сход партыйнай арганізацыі, прысвечаны вынікам майскага пленума ЦК ВКП(б) і чэрвеньскага пленума ЦК КП(б)Б. Даклад аб ходзе выканання пастановы ЦК ВКП(б) і СНК СССР «Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання» зрабіў сакратар райкома партыі тав. Крывянчук.

— Толькі ў рэзультаце патурання мясцовых партыйных і совецкіх арганізацый, — гаворыць тав. Крывянчук, — магло атрымацца такое становішча, калі ў асобных калгасах раёна да 15 процантаў калгаснай зямлі было разбазарана. У радзе калгасаў аслабла працоўная дысцыпліна.

Выступаючыя на сходзе комуністы жорстка крытыкавалі райком і райвыканком за марудную работу па ліквідацыі дапушчаных нарушэнняў статута сельгасарцелі.

— У нашым раёне,—гаворыць т. Гальперын, — захват калгасных зямель прыняў масавы характар. Аднак ніякай барацьбы з гэтай антыкалгаснай практыкай не праводзілася.

Тав. Сакоўскі ў сваім выступленні прыводзіць факт, калі матэрыял на аднаго аднаасобніка, захваціўшага калгасную зямлю, быў перадан раённаму пракурору. Але апошні звярнуў матэрыял з рэзалюцыяй: «Прымяніце пастанову ЦК ВКП(б) і СНК СССР». На сходзе прыводзіліся факты ліберальных адносін райкома да комуністаў, якія самі нарушаюць статут сельскагаспадарчай арцелі.

Старшыня калгаса «Савічы» тав. Новік расказаў сходу аб вопыце работы па ссяленню хутароў. У калгасе трэба было ссяліць 28 хутароў, сселена ўжо 21.

У прынятай рэзалюцыі партыйны сход аднадушна адобрыў рашэнні пленумаў ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б і намеціў практычныя мерапрыемствы па ліквідацыі нарушэнняў статута сельскагаспадарчай арцелі і па ссяленню хутароў у калгасныя цэнтры.

(БЕЛТА).

ДЗЯРЖЫНСК

11 чэрвеня адбыўся пашыраны пленум Дзержынскага райкома КП(б)Б з удзелам сакратароў первічных партыйных арганізацый, комуністаў — старшынь сельсоветаў і калгасаў, дырэктароў МТС. На пленуме прысутнічала 67 чалавек.

Даклад аб выніках майскага пленума ЦК ВКП(б) і чэрвеньскага пленума ЦК КП(б)Б зрабіў сакратар райкома партыі тав. Папкоўскі; аб падрыхтоўцы да ўборкі і загатоўкі сельгаспрадуктаў даклад зрабіў старшыня райвыканкома тав. Плянто.

Пасля дакладаў разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі. Усяго выступіла 25 чалавек. Таварышы аднадушна адзначалі, што рашэнні ЦК ВКП(б) і СНК СССР «Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання» з'яўляюцца праяўленнем мудрых сталінскіх клопатаў аб умацаванні калгаснага ладу, аб росквіце заможнага і культурнага жыцця калгаснікаў. Таварышы расказвалі, з якім велізарным палітычным уздымам сустрэлі калгасныя масы гэтую гістарычную пастанову партыі і ўрада.

Выступаўшыя таварышы расказвалі аб праведзенай рабоце па ссяленню хутароў у калгасныя паселішчы. Па раёну ўжо сселена 300 хутароў. Ідучы насустрач жаданням калгаснікаў, партарганізацыя абавязалася закончыць ссяленне хутароў да 1 ліпеня.

Зараз у калгасы паслан партыйны актыў, агітатары для раз'яснення калгаснікам пастановы ЦК ВКП(б) і СНК СССР «Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання».

Пленум аднадушна адобрыў рашэнні пленумаў ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б і абавязаў партыйныя арганізацыі раёна паболышэвіцку іх выканаць.

ПУХАВІЧЫ

Гэтымі днямі адбыўся пленум Пухавіцкага райкома партыі з удзелам сакратароў первічных партарганізацый, комуністаў — старшынь сельсоветаў і калгасаў, кіраўнікоў раённых, совецкіх, кааператыўных і зямельных арганізацый.

Пленум абмеркаваў вынікі работы майскага пленума ЦК ВКП(б) і чэрвеньскага пленума ЦК КП(б)Б. Выступаўшыя ў спрэчках таварышы расказвалі аб вялікім палітычным уздыме сярод калгаснікаў у сувязі з рашэннем ЦК ВКП(б) і СНК СССР «Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання». У сваіх выступленнях таварышы падкрэслівалі, што пастанова партыі і ўрада накіравана на ўмацаванне калгаснага ладу; у ёй праяўляюцца сталінскія клопаты аб большэвіцкіх калгасах і заможным і культурным жыцці калгаснікаў.

Пленум прыняў пастанову, у якой аднадушна адобрыў рашэнні пленумаў ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б і намеціў канкрэтныя мерапрыемствы па правядзенню іх у жыццё.

У ЧЭСЦЬ ГАДАВІНЫ ВЫЗВАЛЕННЯ БССР АД БЕЛАПАЛЯКАЎ

МАГІЛЕЎ, 12 чэрвеня. На лупалаўскім лугу адбыўся фініш ваенізаванага пераходу Бабруйск—Магілеў, прысвечанага 19 гадавіне вызвалення БССР ад белапалякаў. Асоавіяхімаўцы і фізкультурнікі Магілева цёпла сустрэлі ўдзельнікаў пераходу — асоавіяхімаўцаў Бабруйска.

Удзельнікі пераходу Бабруйск—Магілеў прайшлі 115 кілометраў у працівагазах, з вінтоўкамі і поўным баявым снаражэннем за два дні. На шляху следвання яны праводзілі ў калгасах гутаркі аб міжнародным становішчы і рашэннях Трэцяй Сесіі Вярхоўнага Совета СССР. У калгасе «Букіно», Кіраўскага раёна, пасля гутаркі быў арганізаван вечар мастацкай самадзейнасці.

Усе ўдзельнікі каманды маюць па 3—4 абаронныя значкі. Камандор тав. Гройсблат, тт. Канстанцінаў, Бабікаў і інш.—выдатныя варашылаўскія стралкі.

(БЕЛТА)

У ДАПАМОГУ ПРАПАГАНДЫСТУ І АГІТАТАРУ

СПАЛУЧЭННЕ ГРАМАДСКІХ І АСАБІСТЫХ ІНТАРЭСАЎ ПРЫ СОЦЫЯЛІЗМЕ

I.

Пастанова ЦК ВКП(б) і Соўнаркома СССР «Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання» — велізарная падзея ў жыцці калгаснага сялянства.

Гэтая пастанова канкрэтызіруе і развівае гістарычныя рашэнні XVIII з'езда партыі аб барацьбе за далейшае ўмацаванне калгаснага ладу.

Яна з'яўляецца ўзорам марксісцка-ленінскага навуковага прадбачання. Сіла марксізма-ленінізма заключаецца ў тым, што ён узбройвае нашу партыю веданнем законаў грамадскага развіцця. Кожнае мерапрыемства, кожнае сваё рашэнне партыя абгрунтоўвае навукова, апіраючыся на марксісцка-ленінскую тэорыю.

Ленін і Сталін не раз указвалі, што пабудова соцыялізма не можа развівацца інакш, як у барацьбе з варожымі класамі, сіламі, траўлыцямі. Узнікненне супярэчнасцей і пераадаленне іх ёсць закон усякага развіцця, у тым ліку і развіцця соцыялізма.

Для таго, каб умела арганізаваць рабочых і сялян на соцыялістычнае будаўніцтва, каб не таптацца на месцы, не плесціся ў хвасце падзей і не падвяргаць справу соцыялізма выпадковасцям, трэба,— вучыць таварыш Сталін, — не толькі ведаць тое, што неабходна рабіць у даны момант, але і прадбачыць ход падзей, трэба ўмець распазнаваць, куды і як будуць развівацца падзеі ў будучым.

Як самы пераход сялянства да калгасаў, так і далейшае развіццё калгасаў з'яўляецца працэсам супярэчлівым. Супярэчнасць выцякае з таго, што сялянская гаспадарка вякамі была аднаасобнай, прыватнаўласніцкай, дробнатаварнай. Селянін, як уласнік сродкаў вытворчасці і як таваравытворца, быў зацікаўлен толькі ў сваёй **асабістай** гаспадарцы, у сваім **асабістым** лёсе, у сваім **асабістым** добрабыце.

Усё ўстройства буржуазнага грамадства грунтуецца на асабістай нажыве, на прыватнай уласнасці. Гэта ўласціва ўсяму буржуазнаму грамадству, гэта імкненне ўласціва было і аднаасобнаму сялянству.

Соцыялізм-жа ёсць такое грамадства, асновай існавання якога з'яўляецца **грамадская** ўласнасць на сродкі вытворчасці. Калі для буржуазнага грамадства прыватная ўласнасць — пытанне жыцця і смерці, то лёсы соцыялізма вырашаюцца існаваннем і ўмацаваннем грамадскай уласнасці.

II.

Асновапаложнікі комунізма — Маркс і Энгельс прадбачылі неабходнасць пераўтварэння сялянскіх гаспадарак у грамадскую, соцыялістычную гаспадарку. Але яны, вядома, не мелі яшчэ неабходнага гістарычнага матэрыялу, каб вырашыць гэтае пытанне канкрэтна.

Ленін, грунтуючыся на ўказаннях Маркса і Энгельса і на вопыце першых год існавання совецкай улады, стварыў вялікі план пераўтварэння сялянскай гаспадаркі ў соцыялістычную.

Патрэбаваўся рад год упорнай, крапатлівай работы, каб падрыхтаваць сялянства да калектывізацыі, каб стварыць неабходныя матэрыяльныя прадпасылкі для гэтага. У 1929 годзе — у год вялікага пераломy—сялянства масамі стала пераходзіць у калгасы. Мы перайшлі да ліквідацыі кулацтва як класа.

«Гэта быў найглыбейшы рэволюцыйны пераварот, скачок са старога якаснага стану грамадства ў новы якасны стан, роўназначны па сваіх выніках рэволюцыйнаму перавароту ў кастрычніку 1917 года» («Кароткі курс гісторыі ВКП(б)», стар. 291).

Гэтая вялікая гістарычная перамога была заваявана дзякуючы геніяльнаму кіраўніцтву таварыша Сталіна.

Таварыш Сталін усебакова развіў вучэнне марксізма-ленінізма аб соцыялізме наогул і, у прыватнасці, аб перамозе соцыялізма ў сельскай гаспадарцы. Таварыш Сталін стварыў вучэнне аб суцэльнай калектывізацыі і аб ліквідацыі кулацтва як класа. Рухаючы ўперад марксісцка-ленінскую тэорыю, таварыш Сталін даў геніяльнае вырашэнне пытання аб форме грамадскай уласнасці ў сельскай гаспадарцы, якая забяспечыла-б перавагі соцыялізма, яго тяжарства і разам з тым задаволіла-б і асабістыя інтарэсы селяніна.

Гэта знайшло сваё выражэнне ў вучэнні аб арцельнай, калгаснай форме гаспадаркі, як галоўнай, рашаючай умове пераходу сялянства да соцыялізма і выхавання калгаснікаў у духу калектывізма. «...Галоўнай формай калгаснага руху ў даны момант з'яўляецца сельскагаспадарчая арцель... Зараз мы павінны трымаць курс не на комуну, а на сельскагаспадарчую арцель, як галоўную форму калгаснага будаўніцтва...» (І. Сталін. «Пытанні ленінізма», стар. 333).

Калгас ёсць **соцыялістычная форма** гаспадаркі. А з гэтага вынікае, што пры правільным большэвіцкім кіраўніцтве калгасамі забяспечваецца соцыялістычны **змест** іх работы. Пры правільным кіраўніцтве калгасамі — пры забеспячэнні ў іх правільнай арганізацыі працы і правільнай аплаты працы — с.-г. арцель найбольш удала спалучае грамадскія і асабістыя інтарэсы сялян-калгаснікаў.

Перавагі калгаснай гаспадаркі заключаюцца ў тым, што гэта: а) буйная гаспадарка, а буйная гаспадарка больш рэнтабельна, больш выгадна; б) механізаваная гаспадарка, аснашчоная найбольш перадавой сельскагаспадарчай тэхнікай; в) найбольш арганізаваная гаспадарка, г. зн. вядзецца найбольш разумна, правільна і рацыянальна скарыстоўваючы чалавечую працу; г) соцыялістычная гаспадарка, бо асноўныя прылады і сродкі вытворчасці абагулены.

Але паколькі на першых парах калгасная гаспадарка яшчэ не можа задаволіць усе асабістыя бытавыя запатрабаванні калгаснікаў, партыя і ўрад лічаць неабходным захаваць у пэўнай меры асабістую, падсобную, прысядзібную гаспадарку калгасніка.

«...Арцель, — гаварыў таварыш Сталін на XVII з'ездзе партыі, — з'яўляецца пры цяперашніх умовах адзіна правільнай формай калгаснага руху. І гэта зусім зразумела: а) арцель правільна спалучае асабістыя, бытавыя інтарэсы калгаснікаў з іх грамадскімі інтарэсамі, б) арцель удала прыстасоўвае асабістыя, бытавыя інтарэсы — да грамадскіх інтарэсаў, абягчаючы тым самым выхаванне ўчарашніх аднаасобнікаў у духу калектывізма». (Тамжа, стар. 581).

Партыя ў кіраўніцтве калгасным будаўніцтвам заўсёды ўдзяляла першачарговую ўвагу грамадскай калгаснай вытворчасці і разам з тым у мэтах больш поўнага задаволення асабістых патрэбнасцей калгаснікаў вяла палітыку на дапушчэнне ў пэўнай меры падсобнай, асабістай, прысядзібнай гаспадаркі калгасніка.

Совецкі ўрад аказаў велізарную дапамогу калгаснікам у набыцці кароў, авечак, свіней для асабістага карыстання. Рэзультаты ў наяўнасці: ліквідавана бескароўнасць.

20—30 млн. беднякоў, якія жылі раней упрогаладзь, увайшоўшы ў калгасы, сталі ўжо ў першыя годы калектывізацыі людзьмі ўпаўне забяспечанымі.

Галоўным, рашаючым у калгасе з'яўляецца грамадская гаспадарка. Таму аснова добрабыту калгасніка не ў асабістай, падсобнай, прысядзібнай гаспадарцы, а ў росце грамадскага калгаснага багацця.

У кожнай вобласці ёсць сотні калгасаў, дзе многія тысячы калгаснікаў пры правільна арганізаванай, чэснай і добрасумленнай рабоце ў грамадскай гаспадарцы сталі заможнымі.

III.

Многія кіраўнікі партыйных і совецкіх органаў не зразумелі або забыліся, што ключ да добрабыту калгаса і да заможнага жыцця калгаснікаў ляжыць у правільным спалучэнні грамадскіх і асабістых інтарэсаў калгаснікаў, у **прыстасаванні** асабістых інтарэсаў да грамадскіх, у большэвіцкай арганізаванасці калгаса, у правільнай арганізацыі працы і ва ўстраненні ўсякай ураўнілаўкі.

Замест гэтага некаторыя кіраўнікі пайляліся ў хвасце падзей, адступілі ад калгаснага статута, ад лініі партыі ў калгасным будаўніцтве і сталі на апартуністычны шлях.

Пастанова ЦК ВКП(б) і Соўнаркома СССР «Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання з уласцівай ленінска-сталінскай партыі прынцыповасцю і глыбінёй ускрывае буржуазныя тэндэнцыі ў калгасах, сур'ёзныя скажэнні калгаснага статута, указвае на разбазарванне грамадскіх зямель калгасаў у карысць прысядзібных гаспадарак і на наяўнасць значнай колькасці мнімых калгаснікаў, якія скарыстоўваюць калгас у асабістых, спекуляцыйных мэтах.

У пастанове ЦК ВКП(б) і Соўнаркома СССР гаворыцца, што з-за нарушэння статутных палажэнняў аб прысядзібных землях, з-за разбазарвання і раскрадання грамадскіх зямель калгасаў і раздування асабістых гаспадарак калгаснікаў, з-за неразбярыхі і беспарадку ў зямельнай гаспадарцы калгасаў прысядзібная гаспадарка трапіць часам характар падсобнай гаспадаркі і ператвараецца ў асноўную крыніцу даходу калгасніка.

Няма чаго гаварыць, што мнімыя калгаснікі, для якіх калгас толькі зручная шырма для прыкрыцця сваіх спекулянцкіх махінацый, у калгасе знаходзяцца толькі для відзімасці, каб скарыстаць перавагі, ільготы, якія дае калгас; такія «калгаснікі»-дармаеды, якія сядзяць на шыі чэснага калгасніка, шкодзяць усёй справе калгаснага будаўніцтва, усёй масе калгаснікаў, бо асноўная пераважная маса калгаснікаў працуе чэсна і добрасумленна.

Вось прыклад, які гаворыць аб тым, як раздуванне асабістай гаспадаркі б'е па інтарэсах грамадскай. Калгас імені Мічурына (Тенькаўскі раён, Татарская АССР) закончыў 1938 год з нездавальняючым вынікам: план хлебапаставак дзяржаве не быў выкананы, грашовыя плацяжы па дзяржаўнаму страхаванню і падаходнаму падатку таксама не былі ўнесены. Калгаснікі атрымалі на працадзень да 100 грам хлеба і 37,8 капейкі грашыма. Дзе карэнні гэтага? Яны крыюцца ў аслабленні працоўнай дысцыпліны, у раздуванні прыватнай гаспадаркі многімі членамі гэтай арцелі. 14 калгаснікі за 1938 г. не выпрацавалі ні аднаго працадня, 16 членаў калгаса выпрацавалі ад 1 да 50 працадзён. У той час, калі максімальны размер прысядзібных участкаў для гэтага раёна ўстаноўлен у 0,6 гектара, у калгасніка Грыгорыя Міронава сядзіба размерам 1,02, у тым ліку сад у 0,8 гектара. Некаторыя калгаснікі маюць прысядзібныя ўчасткі ў двух—трох месцах.

Вядома, пры гэтых умовах людзі ўсе свае сілы накіроўвалі ў асабістую гаспадарку, на якую яны глядзелі, як на таварную гаспадарку, як на крыніцу нажывы і спекуляцыі.

У гэтым калгасе ёсць нямала добрых калгаснікаў, якія чэсна працуюць у грамадскай вытворчасці. 25 калгаснікаў выпрацавалі ад 300 да 400 працадзён, 29 калгаснікаў — больш 400 працадзён. Мерапрыемствы партыі і ўрада ідуць на дапамогу гэтым калгаснікам у іх барацьбе за інтарэсы грамадскай гаспадаркі, супроць усякіх дармаедаў, спекулянтаў, рвачоў, дэзарганізатараў калгаснай вытворчасці.

Сіла перажыткаў капіталізма ў сазнанні калгаснікаў яшчэ вельмі значная: уступіўшы ў калгас, селянін не стаў яшчэ соцыялістам па свайму сазнанню. Неабходна велізарная і ўпорная палітыка-выхаваўчая работа. Між тым многія кіраўнікі забыліся аб комуністычным выхаванні, забылі ўказанні таварыша Сталіна аб правільным спалучэнні асабістых і грамадскіх інтарэсаў у калгасах, дапусцілі адступленне ад грамадскіх інтарэсаў і аддалі перавагу асабістым інтарэсам у шкоду інтарэсам грамадскім.

Толькі ўважлівы, марксісцкі падыход дазваляе правільна бачыць супярэчнасці, узнікаючыя ў ходзе калгаснага будаўніцтва, якія неабходна пераадольваць, каб з поспехам рухацца ўперад. Марксісцка-ленінская тэорыя вучыць, што супярэчнасці ёсць крыніца ўсякага руху ўперад. Задача заключаецца ў тым, каб умець своечасова пазнаваць узнікаючыя супярэчнасці, пераадольваць іх і тым самым больш паспяхова рухацца да пастаўленай мэты. «...Дыялектычны метад лічыць, што працэс развіцця ад ніжэйшага да вышэйшага працякае не ў парадку гарманічнага разгортвання з'яў, а ў парадку раскрыцця супярэчнасцей, уласцівых прадметам, з'явам, у парадку «барацьбы» процілеглых тэндэнцый, дзеючых на аснове гэтых супярэчнасцей». («Кароткі курс гісторыі ВКП(б)», стар. 104).

Супярэчнасці, існуючыя ў калгасах, ёсць супярэчнасці паміж грамадскім і асабістым.

Таварыш Сталін вучыць бачыць гэтыя супярэчнасці і ўстраняць іх актыўнай дзейнасцю комуністычнай партыі і совецкай дзяржавы.

IV.

Ва ўмовах соцыялістычнага ладу паміж асабістымі і грамадскімі інтарэсамі няма непераадалімых супярэчнасцей.

«Непрымірымага кантрасту паміж індывідуумам і калектывам, паміж інтарэсамі аддзельнай асобы і інтарэсамі калектыва няма, не павінна быць. Яго не павінна быць, бо калектывізм, соцыялізм не адмаўляе, а сумяшчае індывідуальныя інтарэсы з інтарэсамі калектыва. Соцыялізм не можа адхіляцца ад індывідуальных інтарэсаў. Даць найбольш поўнае задавальненне гэтым асабістым інтарэсам можа толькі соцыялістычнае грамадства. Больш таго, — соцыялістычнае грамадства прадстаўляе адзіна трывалую гарантыю аховы інтарэсаў асобы. У гэтым сэнсе непрымірымага кантрасту паміж «індывідуалізмам» і соцыялізмам няма». (І. Сталін. «Пытанні ленінізма», стар. 602).

Соцыялізм — такі грамадскі лад, дзе найбольш поўна і паслядоўна спалучаюцца гэтыя інтарэсы. На аснове росту грамадскага багацця соцыялізм забяспечвае ўсебаковае задавальненне асабістых інтарэсаў, усебаковае культурнае развіццё асобы.

Спалучэнне грамадскіх і асабістых інтарэсаў і задавальненне асабістых інтарэсаў соцыялізм забяспечвае тым, што адзіна справядлівым чынам узнагароджвае за працу кожнага, хто працуе на агульную карысць, у інтарэсах ўсяго грамадства. Прынцып соцыялізма — ад кожнага па яго здольнасцях, кожнаму па яго працы— ажыццёўлен у нас поўнасцю.

У СССР знішчаны эксплаататарскія класы, знішчана і эксплаатацыя. Значыцца, ніхто ў нас не можа эксплаатаваць працу другіх людзей. Усё, што ствараецца працоўнымі, палкам ідзе на агульную карысць, цалкам ідзе самім працоўным.

І кожнаму рабочаму, служачаму і калгаснику павінна быць таму зразумела, што чым больш чэсна, больш добрасумленна ён будзе працаваць на фабрыцы, на заводзе, ва ўстанове, у калгасе, тым больш багата стане наша грамадства, тым больш магчымасцей будзе мець кожны для задавальнення сваіх асабістых патрэбнасцей.

Пры соцыялізме кожны атрымлівае ў адпаведнасці з тым, колькі ён даў грамадству, гэта значыць ажыццяўляецца роўнае права кожнага атрымліваць па колькасці і якасці працы. А гэта якраз і дае магчымасць улічыць і забяспечыць індывідуальныя патрэбнасці, адзначыць добрых работнікаў і аддзяліць ад іх работнікаў дрэнных і нерадзівых.

Таварыш Сталін гаварыў:

«Такога соцыялізма, пры якім усе людзі атрымлівалі-б адну і тую-ж плату, аднолькавую колькасць мяса, аднолькавую колькасць хлеба, насілі-б адны і тыя-ж касцюмы, атрымлівалі-б адны і тыя-ж прадукты ў адной і той-жа колькасці,—такога соцыялізма марксізм не ведае. Марксізм гаворыць толькі адно: пакуль канчаткова не знішчаны класы, і пакуль праца не стала з сродку для існавання першай патрэбнасцю жыцця, добраахвотнай працай на грамадства, людзі будуць аплачвацца за сваю работу па працы. «Ад кожнага па яго здольнасцях, кожнаму па яго працы», — такая марксісцкая формула соцыялізма, г. зн. формула першай стадыі комунізма, першай стадыі комуністычнага грамадства». (І. Сталін. «Гутарка з нямецкім пісьменнікам Эмілем Людвігам». Партвыдат, 1937 г., стар. 35—36).

Далейшае развіццё соцыялізма стварае яшчэ большыя магчымасці для поўнага і ўсебаковага задавальнення асабістых патрэбнасцей. У СССР пачаўся паступовы пераход к комунізму. Пры комунізме грамадскія багацці будуць у ізабіллі, усе блага пальюцца поўным патокам, пануючым прынцыпам будзе: «ад кожнага па яго здольнасцях, кожнаму па яго патрэбнасцях».

V.

Нарушэнні марксісцка-ленінскіх прынцыпаў калгаснага будаўніцтва знайшлі адлюстраванне і на старонках тэарэтычных журналаў. Замест сур'ёзнага соцыяльна-эканамічнага аналіза ўзаемаадносін асабістай і грамадскай гаспадаркі, замест большэвіцкай непрымірымасці да ўшчамлення грамадскіх інтарэсаў калгасаў, іншыя аўтары тэарэтычных работ прыходзяць у цялячае захапленне ад кожнай цыфры, якая паказвае рост асабістай, падсобнай гаспадаркі калгаснікаў, і зусім абыходзяць чуждыя буржуазныя тэндэнцыі, занасімыя ў калгасы рвачкімі, спекуляцыйнымі элементамі і астаткамі разбітага кулацтва.

Так, у № 1 журнала «Социалистическое сельское хозяйство» за мінулы год у артыкуле Г. Гарбаценка «Рост заможнасці ў калгасах Кубані» развіваецца тэорыя, што рост калгаснай гаспадаркі прыводзіць да росту асабістай, падсобнай гаспадаркі. «На аснове росту калгаснай гаспадаркі з кожным годам мацнее і падсобная гаспадарка калгасніка, у прыватнасці, жывёлагадоўля асабістага карыстання» (стар. 93). Аўтар артыкула эпічна апавядае, што «пераважаючую частку прадуктаў жывёлагадоўлі і агароднiцтва калгаснік атрымлівае ад падсобнай гаспадаркі» (стар. 92). А што з гэтага выцякае? — Ні слова.

У № 6 таго-ж журнала за мінулы год В. Шыман у артыкуле «Калгас імені Шэўчэнка» прыводзіць многа цыфр, якія сведчаць, што ў жывёлагадоўчай ферме гэтага калгаса колькасць кароў з 1935 па 1937 г. вырасла з 25 да 34. Такім чынам, за два годы прыбавілася 9 кароў. А ў асабістай гаспадарцы калгаснікаў колькасць кароў вырасла за той-жа час на 71 галаву. І аўтар з гэтага поваду толькі канстатуе, што «жывёлагадоўля, якая знаходзіцца ў асабістым карыстанні калгаснікаў, з года ў год развіваецца» (стар. 158), не цікавячыся тым, да чаго гэта вядзе.

У № 4 журнала за красавік гэтага года (падпісан да друку 19 красавіка, г. зн. праз месяц пасля XVIII з'езда партыі) надрукаван артыкул В. Шнеерсон «Рэзервы ў скарыстанні рабочай сілы калгасаў...». Тут сказана, што ў Саратаўскай вобласці 31,3 проц. калгаснікаў выпрацавалі менш ста працадзён у годзе. І вось аўтар пачынае шукаць прычыны слабага скарыстання рабочай сілы ў калгасах і ў першую чаргу ўказвае на тое, што «ва многіх выпадках праўленні калгасаў не ўдзяляюць увагі асабістай падсобнай гаспадарцы калгаснікаў, не аказваюць ім дапамогі ў апрацоўцы сваіх прысядзібных участкаў» (стар. 81).

Вядома, аўтар гаворыць далей і аб другой прычыне—аб нарушэннях дысцыпліны, аб тых, якія ставяць інтарэсы асабістыя вышэй інтарэсаў грамадскіх. Аднак у яго канцы з канцамі не зведзены. Калі тав. Шнеерсон сапраўды клапоціцца аб развіцці грамадскай гаспадаркі, то якжа ён у 1939 годзе, калі ясна вызначыліся скажэнні статута сельскагаспадарчай арцелі, як ні ў чым не бывала, наракае на тое, што калгасы дрэнна клапоцяцца аб асабістых, падсобных гаспадарках калгаснікаў, і ў гэтым перш за ўсё шукае прычыну слабага скарыстання рабочай сілы ў калгасах. На справе абстаіць якраз наадварот. Недастатковае скарыстанне рабочай сілы ў калгасах аб'ясняецца не слабым развіццём, а **раздуваннем** асабістай гаспадаркі калгасніка.

У вульгарызацыі марксісцкага разумення ўзаемаадносін і адрозненняў паміж соцыялістычнай і асабістай уласнасцю пабіў рэкорд тав. Орлоўскі. У журнале «Советское государство», у № 6 за мінулы год, у артыкуле «Права асабістай уласнасці грамадзян» з вучоным выглядам ён апавядае:

«Паміж грамадскай соцыялістычнай уласнасцю і асабістай уласнасцю існуе неразрыўная, арганічная сувязь. Умацаванне і развіццё грамадскай соцыялістычнай уласнасці забяспечваюць умацаванне і развіццё асабістай уласнасці. Будучы вытворнай ад грамадскай соцыялістычнай уласнасці, асабістая ўласнасць павышае зацікаўленасць працоўных у соцыялістычнай вытворчасці, садзейнічае павышэнню прадукцыйнасці працы і ўмацаванню грамадскай соцыялістычнай уласнасці... Асабістая ўласнасць грамадзян СССР па сваёй прыродзе ёсць соцыялістычная ўласнасць. Яна, не будучы тоесамнай, аднатыпна з соцыялістычнай уласнасцю на сродкі вытворчасці» (стар. 71—72).

Каб не было сумнення ў тым, што пад асабістай уласнасцю аўтар разумее не толькі ўласнасць на прадметы спажывання і хатняга ўжытку, П. Орлоўскі паясняе, што «ў грамадзян СССР могуць быць на праве асабістай уласнасці і дробныя прылады і сродкі вытворчасці, але яны маюць падсобнае значэнне ў адносінах да асноўных аб'ектаў асабістай уласнасці» (стар. 72).

Ва ўсіх гэтых разважаннях П. Орлоўскага марксісцкае разуменне асабістай і грамадскай гаспадаркі перавернута ўверх нагамі. Трэба-ж ладумацца, каб сродкі вытворчасці, якія знаходзяцца ў асабістай уласнасці,—праўда, маючыя другараднае значэнне,—аб'явіць соцыялістычнай уласнасцю.

Прыведзеныя прыклады паказваюць, што работнікі тэарэтычнага фронта яшчэ не аслабаніліся ад вульгарызацыі і скажэння марксісцкай тэорыі. Ці трэба даказваць, што падобныя тэорыйкі спрыялі апартуністычнай практыцы, правядзімай у калгасах.

Пара зразумець і работнікам тэарэтычнага фронта, што цяпер, калі калгасны лад умацаваўся, трэба ўдарэнне зрабіць на ўмацаванні і расшырэнні грамадскай калгаснай гаспадаркі з тым, каб сістэматычна павышалася яе роля ў задавальненні патрэбнасцей і ў даходах калгаснікаў.

Трэба памятаць і не забываць указанні тав. Андрэева на XVIII з'ездзе, што «правільнае спалучэнне асабістых інтарэсаў і грамадскіх у калгасах астаецца асновай калгаснага ладу, але асабістая гаспадарка калгасных двароў павінна усё больш насіць вузка-падсобны характар, а агульнакалгасная — узрастаць як асноўная».

П. ЮДЗІН.

(«Правда» за 12 чэрвеня).

ПА-БОЛЬШЭВІЦКУ ВЫКАНАЦЬ РАШЭННІ МАЙСКАГА ПЛЕНУМА ЦК ВКП(б)

★ ★ ★

У МАКСІМАЛЬНА КАРОТКІЯ ТЭРМІНЫ

У нашым раёне ёсць 1.880 хутарскіх сядзіб. Ва ўсім раёне разгарнулася работа па ссяленню калгаснікаў з хутарскіх сядзіб. На 13 чэрвеня сселена ў калгасныя паселішчы 810 калгасных двароў, з іх 363 адбудаваны.

У сельскагаспадарчай арцелі «Новае жыццё», Вярхменскага сельсовета, сселена і адбудавана 20 двароў. У сельгасарцелі «Авангард», Жодзінскага сельсовета,—24, у калгасе імені Свердлова, Жажэлкаўскага сельсовета,—20 двароў. У Жажэлкаўскім сельсавеце (старшыня сельсовета тав. Залескі) зусім нядаўна было 111 хутарскіх сядзіб. На сённешні дзень поўнасцю закончана ссяленне, з іх 45 двароў ужо адбудаваны.

Таксама закончана ссяленне калгаснікаў у Жодзінскім сельсавеце.

Я хачу адзначыць вялікую ролю совецкага актыва ў паспяховым ссяленні калгаснікаў. Члены сельскіх советаў, вясковая інтэлігенцыя праводзяць вялікую агітацыйную работу. На аснове масавай работы паспяхова разгортваецца ссяленне калгаснікаў таксама ў Емельянаўскім, Клёнцкім і Прыленскім сельсоветах. К 20 чэрвеня тут поўнасцю будзе закончана ссяленне калгаснікаў.

У раёне будуюцца прыгожыя калгасныя паселішчы з шырокімі вуліцамі. Зразумела, што работа на гэтым не заканчваецца. Прадстаіць вялікая работа па ўпарадкаванню калгасных паселішчаў, па іх азеляненню, капанню калодзежаў. І гэта работа будзе выканана ў максімальна кароткія тэрміны.

Н. АБРАМЕНКА,
старшыня Смалявіцкага райвыканкома.

ПРАВІЛЬНА АРГАНІЗАВАЦЬ ПРАЦУ

СІРОЦІНА. ЦК ВКП(б) і СНК СССР у пастанове «Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання» вызначылі канкрэтныя мерапрыемствы па ссяленню калгаснікаў з хутароў у паселішчы. Калгаснікі раёна горача адгукнуліся на пастанову партыі і ўрада—пажадалі як мага хутчэй пакончыць з хутарамі, ссяліцца ў калгасныя вёскі. Аднак, раённыя кіруючыя арганізацыі не арганізавалі ссяленне калгаснікаў.

У раёне налічваецца больш 2000 хутароў. Да гэтага-ж часу ссяленне не атрымала шырокага размаху.

Возьмем к прыкладу Старыноўскі сельсовет. Калгасныя палі зрэзаны сотнямі сцежак і дарог. Многа каштоўнай калгаснай зямлі прападае пад гэтымі дарогамі. Па плану ў сельсавеце неабходна ссяліць 10.7 хутарскіх гаспадарак. Да гэтага часу пачалі ссяляцца толькі 4 гаспадаркі. Гэта ў той час, калі ў сельсавеце ёсць усе магчымасці весці ссяленне ўзмоцненымі тэмпамі: хапае рабочай і цягавай сілы.

У калгасе «Бязбожнік», Пагарэліцкага сельсовета, усе палі заселены хутарамі. Здавалася, што праўленне калгаса возьмецца за арганізацыю ссялення хутарскіх гаспадарак. На справе вышла інакш. Булаўнічыя брыгады калгаса ўкамплектаваны дрэнна, працуюць неарганізавана, не маюць графіка работ. З прычыны гэтага ствараецца неразбярыха ў ссяленні.

Калгаснік гэтай сельгасарцелі Венедзікт Федасенка атрымаў дзяржаўны крэдыт і пачаў перавозіць сваю хату. Аднак праўленне калгаса не аказала яму ніякай дапамогі, і Федасенка больш 3-х месяцаў усё перавозіць свае будынкі. Такое-ж становішча атрымалася з калгаснікам Буравым. Булаўнічая брыгада Сапрыкава, якая адбудоўвае дом гэтага калгасніка, працуе дрэнна, неарганізавана. Старшыня калгаса тав. Новікаў не заняўся пытаннямі арганізацыі працы булаўнічых брыгад.

Неабходна адзначыць, што ў калгасах раёна марудзяць з вызначэннем цэнтраў будучых калгасных паселішчаў. У многіх калгасах (калгас імені Варашылава, Пагарэліцкага сельсовета, і інш.) з-за гэтага зрываецца ссяленне калгаснікаў.

А. ПАЗНЯК.

БЕЗ СТРАТ УБЯРОМ БАГАТЫ ЎРАДЖАЙ

Значных поспехаў дабілася наша МТС у часе веснавой сяўбы. План работ у перавозе на мяккае ворыва выканан на 112 процантаў. Радковая сяўба праведзена на плошчы 1.215 гектараў пры заданні 1.080. Паднята цапару 1.584 гектары, што складае 105,6 процанта. Гадовы план на 10 чэрвеня МТС выканала на 49,7 процанта. Такіх рэзультатаў мы дасягнулі правільнай арганізацыяй працы, умелым падборам і расстаноўкай кадраў.

Уключыўшыся ў сацыялістычнае спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі, трактарысты сістэматычна перавыконвалі ўстаноўленыя нормы. Трактарыст Іван Гарбачоў са сваім напарнікам Ефімам Мазнёвым гадовы план выканалі на 69 процантаў. Яны засеялі радковай сеялкай 208 гектараў пры плане 120. Не на многа адстае і трактарыст Андрэй Марковіч са сваім напарнікам Антаневічам, якія выканалі свой гадовы план на 55 процантаў.

Калгаснікі ў гэтым годзе ўзялі абавязацельства сабраць ураджай зернавых па 12—14 цэнтнераў у сярэднім з кожнага гектара. Барацьба за выкананне гэтага абавязацельства прадаўжаецца на праполы і падрыхтоўчых работах да ўборкі, якая хутка пачнецца.

У сваёй пастанове «Аб падрыхтоўцы да ўборкі ўраджаю і загатовак сельскагаспадарчых прадуктаў у 1939 годзе» партыя і ўрад патрабуюць ад нас своечасова і без страт убраць ураджай. Па зоне нашай МТС камбайнамі намечана ўбраць 1.040 гектараў азімых і яравых культур. Уборку мы намячаем правесці за 10—12 рабочых дзён.

На совеце МТС разам са старшынямі і брыгадзірамі калгасаў, камбайнерамі і трактарыстамі абмяркован план уборкі ўраджаю, зацверджаны маршруты камбайнаў, ільнацерабілак. Пры складанні плана мы ўлічылі ўсе недахопы мінулага года. Асаблівая ўвага звернута на падбор і падрыхтоўку кадраў. МТС падрыхтавала 7 кваліфікаваных камбайнераў, 3 памочнікаў камбайнераў, 9 машыністаў, 9 вагаўшчыкоў і інш.

4 паўночныя і 3 паўднёвыя камбайны будуць працаваць у гэтым годзе ў 21 калгасе па ўборцы азімых і яравых. Плошчы пад камбайны падабраны і ачышчаны ад каменняў. Кожны камбайнер, ільнацерабільшчык ведае свой маршрут і ўчастак. Цяпер мы рэгулярна праводзім семінары камбайнераў, ільнацерабільшчыкаў і трактарыстаў. На семінарах распрацоўваюцца пытанні догляду за машынамі, прафілактыкі, перадачы вопыту лепшых камбайнераў і т. д.

На перыяд уборачных работ МТС поўнасцю забяспечана гаручым і змазачным матэрыялам. Кожны камбайн забяспечан у дастатковай колькасці тарай. Зараз МТС разам з праўленнямі калгасаў падбірае брыгады з лепшых калгаснікаў для абслугоўвання камбайнаў у часе ўборкі. Арганізавана і абсталявана перасоўная аўтамайстэрня. Усе камбайны да пачатку ўборкі будуць адпраўлены на свае ўчасткі.

Своечасовая падрыхтоўка да ўборачных работ дае нам упэўненасць, што ўраджай гэтага года будзе ўбран у самыя стісłыя тэрміны і без малейшых страт.

П. ВІЗІК,
дырэктар МТС імені 20-годдзя БССР, Крупскага раёна.

Аўцаферма калгаса «Чырвонаармеец», Амхоўскага сельсовета, Магілеўскага раёна, прадстаўлена на Ўсесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку. НА ЗДЫМКУ: брыгадзір аўцафермы Ольга Патапенка з калгасным стадам на пасьбішчы. Фото Я. Салавейчыка.

100 ДВАРОЎ ЗА ДЗЕНЬ

УШАЧЫ. (Кар. «Звязды»). Калгаснікі раёна з вялікім уздымам сустрэлі пастанову ЦК ВКП(б) і СНК СССР «Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання». На сходах, мітынгах калгаснікі патрабавалі хутчэйшага правядзення гэтай пастановы ў жыццё.

Калгаснікі раёна абавязаліся да 20 чэрвеня г. г. ссяліць 1340 хутарскіх гаспадарак замест планавых 1200. Гэта абавязацельства калгаснікі з чэсцю выконваюць. Ім актыўна дапамагае раённы партыйны актыў.

Асаблівую ўвагу ў калгасах звярнулі на арганізацыю работы. У калгасах Жарскага сельсовета на будаўнічых работах працуюць звенні. Напрыклад, у калгасе імені Будзённага, дзе трэба да 20 чэрвеня ссяліць 20 хутарскіх двароў, арганізаваны звенні па разборцы будынкаў, перавозцы і адбудаванню іх. Арганізавана асобнае звяно па загатоўцы і падвозцы моху да кожнай хаты. У калгасе наладжваецца выраб вапны.

Ссяленне калгаснікаў праводзіцца строга па графіку. Звенні ведаюць, якія хутарскія двары яны павінны ссяляць кожны дзень. Кожны калгаснік загадзя ведае, калі ён павінен перасяляцца ў калгасную вёску.

Пры такой арганізацыі работы калгас закончыць ссяленне да 18 чэрвеня.

У раёне ёсць калгасы, у якіх няма хутарскіх гаспадарак. Гэтыя калгасы аказваюць актыўную сацыялістычную дапамогу астатнім калгасам. Кожны дзень у раёне ссяляецца па 100 двароў калгаснікаў.

Д. МАЛЕВІЧ.

СКАЖАЮЦЬ ПАСТАНОВУ ПАРТЫІ І ЎРАДА

РУДЗЕНСК, 13 чэрвеня. (БЕЛТА). У Рудзенскім раёне, Менскай вобласці, ёсць рад калгасаў, у якіх апрача хутарскіх гаспадарак ёсць карлікавыя пасёлкі, якія налічваюць па 10—12 двароў.

Аднак, у Рудзенскім раёне не толькі не ліквідуюць карлікавых пасёлкаў, але наадварот, пашыраюць іх за лік ссялянскіх калгаснікаў. Характэрным прыкладам у гэтых адносінах можна прывесці калгас імені XVI з'езда КП(б)Б, Шацкага сельсовета. У калгасе 10 пасёлкаў. Некаторыя з іх налічваюць ад 10 да 15 двароў. Апрача таго, 40 калгасных гаспадарак знаходзяцца на хутарах. Калгас ударным парадкам пачаў ссяленне. 25 двароў перавезена ўжо на новыя месцы. Але не ўсе яны перавезены ў цэнтр калгаса. Большая частка з іх сселена ў карлікавыя пасёлкі. Такім чынам, асноўнай сваёй задачай — пабудаваць новую калгасную вёску з адзіным культурна-гаспадарчым цэнтрам — калгас не выконвае.

Калгас імені XVI з'езда не з'яўляецца выключэннем. У сельгасарцелі «Большэвік», Сяргеевіцкага сельсовета, пры распрацоўцы плана ссялення пасёлак «Смалярня», які налічвае ўсяго 6 двароў, зусім не быў уключан у гэты план. У сельгасарцелі XVII з'езд ВКП(б) да карлікавага пасёлка, які не з'яўляецца цэнтрам калгаса, парашылі ссяліць 6 хутарскіх двароў.

Прыходзіцца здзіўляцца, чаму кіраўнікі раённых арганізацый, ведаючы аб усіх гэтых фактах, не надаюць ім ніякага значэння, чым па сутнасці садзейнічаюць скажэнню пастановы партыі і ўрада аб ссяленні калгаснікаў.

Прыступілі да масавай касьбы

СТАРОБІН. Большасць калгасаў раёна пачалі масавую касьбу сенажаняў. Асабліва паспяхова праходзіць сенакашэнне ў калгасе «Чырвоны пагранічнік». Долгаўскага сельсовета. На касьбе працуюць 4 звяны. Звеннявая работа, як паказалі першыя дні, дае добрыя рэзультаты. У калгасе ўжо скошана 102 гектары, тады як у 1938 годзе да гэтага часу было скошана ўсяго 71 гектар.

Лепшыя паказальнікі дае звяно Івана Спэшыца. Звяно скасіла 31 гектар. Калгаснікі гэтага звяна Ігнат Спэшыц і Валодзя Леўчык выконваюць норму выпрацоўкі на 200 проц.—выкашваюць па 0,98 гектара. Каб пазбегнуць разрыву паміж касьбой і ўборкай, у калгасе арганізаваны тры звяны, якія працуюць толькі па ўборцы і стагаванню сухога сена. Ужо застагавана 5 гектараў сенажаці.

Паспяхова праходзіць касьба ў калгасе «Ударнік», Старобінскага сельсовета. Тут ужо скошана 89 гектараў сенажаці. Яшчэ да пачатку сенакашэння калгаснікі перагледзелі і змянілі нормы выпрацоўкі. Замест старай нормы — 0,35 гектара, калгаснікі ўстанавілі новую—у 0,50 гектара. Калгаснік Антановіч штодзённа скошвае па 1,10 гектара. Перавыконваюць нормы і іншыя калгаснікі.

П. ЛОЙКА.

УСІМ СТАРШЫНЯМ ОРГКАМІТЭТАЎ АБЛАСЦЕЙ, ГОРСОВЕТАМ, РАЙВЫКАНКОМАМ, СЕЛЬСОВЕТАМ І ФІНСЕКЦЫЯМ БССР

XVIII з'езд нашай партыі падвёў вынікі сусветна-гістарычных перамог сацыялізма СССР, прыняў грандыёзны план трэцяй сталінскай пяцігодкі, выкананне якога забяспечыць яшчэ большы росквіт нашай радзімы.

Зацверджаны III Сесіяй Вярхоўнага Совета Саюза ССР дзяржаўны бюджэт на 1939 год у суме звыш 156 мільярдаў рублёў з'яўляецца магутным сродкам ажыццяўлення задач, пастаўленых перад нашай краінай у трэцяй сталінскай пяцігодцы, — магутным сродкам далейшага ўздыму і развіцця ўсіх галін народнай гаспадаркі, росту культуры і добрабыту совецкага народа, умацавання абароназдольнасці сацыялістычнай дзяржавы.

Па дзяржаўнаму бюджэту на 1939 год зацверджаны паступленні па дабравольнаму страхаванню 752 млн. руб. або рост па страхаванню з 1938 г. на 43,8 проц. Гэта абавязвае фінансавыя і страхавыя органы карэнным чынам перабудаваць усю работу па абслугоўванню калгасаў і працоўных па дабравольнаму страхаванню.

На сесіі пры разглядзе і зацвярджэнні дзяржаўнага бюджэта на 1939 год звернута ўвага на неабходнасць у 1939 г. забяспечыць круты ўздым работы па дзяржаўнаму страхаванню і дабіцца, каб яна поўнасцю задавальняла патрабаванні працоўных. Гэта абавязвае нас рашуча палепшыць работу па дзяржаўнаму страхаванню як у горадзе, так і ў вёсцы.

Дзяржаўнае страхаванне ў нашай краіне з'яўляецца магутным рычагом умацавання калгаснай вытворчасці і аховы грамадскай сацыялістычнай маемасці, а таксама аховы асабістай маемасці працоўных ад рознага роду стыхійных бедстваў.

Дабравольныя віды страхавання маюць вялікае значэнне для калгасаў і працоўных у мэтах забеспячэння поўнага вазмяшчэння ўбыткаў для аднаўлення згінуўшай або пашкоджанай маемасці пры стыхійным бедстве. Па калектыўнаму страхаванню жыцця кожны працоўны можа забяспечыць самога сябе і сваю сям'ю атрыманнем ад дзяржавы аднаразовай дапамогі пры няшчасным выпадку. Праз Дзяржстрах калгасы і працоўныя атрымліваюць вялікую дапамогу.

Толькі за адзін 1938 год у БССР органамі Дзяржстраха выплачана ў парадку вазмяшчэння ўбыткаў калгасам і грамадзянам 24 млн. руб.

Аднак, дабравольнае страхаванне ў нашай рэспубліцы развіта недастаткова. Не ўсе калгасы застрахавалі сваю маемасць у дабравольным парадку па звышакладнаму страхаванню. У большасці калгасаў не арганізавана калектыўнае страхаванне жыцця. Дзякуючы слабай масава-раз'яснальнай работы па папулярызацыі дабравольных страхаванняў страхаванне асабістай дамашняй маемасці працоўных развіта яўна недастаткова.

Совет Народных Камісараў звяртае ўвагу ўсіх старшынь оргкамітэтаў абласцей, райвыканкомаў, горсоветаў, сельсоветаў, фінсекцый БССР на неабходнасць поўнага ажыццяўлення задач, пастаўленых Трэцяй Сесіяй Вярхоўнага Совета СССР, — узмацнення масава-раз'яснальнай работы па папулярызацыі дабравольнага страхавання.

Пытанне аб развіцці дабравольнага страхавання абмяркуйце на пасяджэннях оргкамітэтаў абласцей, горсоветаў, райвыканкомаў, сельсоветаў і фінсекцый. Узмацніце дапамогу, кіраўніцтва і кантроль над работай страхавых органаў. Пытанне аб дабравольным страхаванні абмяркуйце на сходах рабочых, служачых і калгаснікаў і намеце практычныя мерапрыемствы, якія забяспечваюць шырокае развіццё дабравольнага страхавання.

Дабійцеся, каб усе калгасы застрахавалі сваю маемасць, пасевы, жывёлу, пабудовы і інвентар у дабравольным парадку па звышакладнаму страхаванню, каб усе калектывы рабочых, служачых, калгаснікаў былі ахоплены калектыўным страхаваннем жыцця, каб страхаванне асабістай дамашняй маемасці працоўных атрымала шырокае развіццё ў нашай рэспубліцы.

Нам. старшыні Совета Народных Камісараў БССР
В. Г. ВАНЕЕЎ.

РАБОТА ФАБКОМА ПРЫЗНАНА НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧАЙ

7 чэрвеня на менскай абутковай фабрыцы імені Кагановіча пачалася справаздача фабрычнага камітэта.

Профсаюзная арганізацыя прадпрыемства за прайшоўшыя два годы дабілася значных поспехаў. Выхаваны дзесяткі членаў профсаюза, якія прымаюць актыўны ўдзел ва ўсіх палітычных кампаніях, з'яўляюцца агітатарамі.

Профактывісты тт. Канцін, Пісарчык, Скабло Г., Скабло З., Розенберг прыняты ў партыю. Павялічылася колькасць стаханаўцаў. На фабрыцы налічваецца 718 стаханаўцаў—больш палавіны ўсяго рабочага калектыва.

Палепшана ахова працы і тэхніка безапаснасці. У цэхах наладжана вентыляцыя. Захворванні рабочых рэзка знізіліся.

Аднак у рабоце фабкома было многа недахопаў. Аб іх гаварылі члены профсаюза, выступаўшыя ў спрэчках па справаздачных дакладах фабкома і рэвізійнай камісіі.

Фабрычны камітэт мала цікавіўся работай цэхаў. Вытворчыя нарады склікаліся рэдка і не давалі належнага эфекту, унесеныя прапановы не ажыццяўляліся. Аб гэтым сказаў на справаздачным сходзе начальнік штамповачнага цэха т. Баскін.

Многія рабочыя і інтэлігенты рэзка крытыкавалі фабком за адсутнасць належнай увагі да фабрычнай сталоўкі, дзіцячых ясляў і саду, інтэрнатаў, якія працуюць дрэнна.

З садаклада рэвізійнай камісіі выяснілася, што фабком груба нарушаў фінансавую дысцыпліну. Грашовая справаздачнасць вельмі заблытана. Рэвізійная камісія (тт. Фрыдлянд, Хейман і Дрыкер) не кантраліравала расходванне профсаюзных сродкаў. За два годы яна правяла толькі адну рэвізію спраў фабкома, ды і, то толькі напярэдадні яго справаздачы.

— Зусім мала займаўся фабком абароннай работай, — заявіў майстар першага пашывачнага цэха тав. Мірончык. Сродкі, асігнаваныя па каштарысу фабкома для гэтай мэты, за мінулы год выкарыстаны толькі напалавіну.

Стаханавец другога пашывачнага цэха тав. Майсейчык у сваім выступленні адзначыў, што фабком зусім не дапамагаў адстаючым цэхам. Другі пашывачны цэх не выходзіць з прарыву, профсаюзная работа там развалена.

Мала клапаціўся фабком аб упягненні ў профсаюз новых рабочых. На 1 мая 44 рабочых яшчэ не прыняты ў саюз. Многія з іх працуюць на фабрыцы ўжо больш года. Разгляд заяў і выдача профбілетаў недапушчальна зацягваецца. Пэхком другога пашывачнага цэха поўгода не разглядаў шэсць заяў аб прыёме ў саюз. Работніцы тт. Лянько і Грыбовіч атрымалі профсаюзныя білеты толькі праз год пасля прыняцця іх агульным сходам у саюз.

Усяго на сходах выступіла па справаздачы фабкома 19 чалавек. Работа фабкома прызнана нездавальняючай.

М. ПАКРОЎСКІ.

ХІМІЗАЦЫЯ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ БССР У ТРЭЦІМ ПЯЦІГОДДЗІ

★

І. ЧОРНЫ
Старшыня Дзяржплана БССР.

★ ★ ★

У рэзалюцыі XVIII з'езда ВКП(б) па дакладу таварыша Молатава аб трэцім пяцігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі СССР гаворыцца: «...ператварыць **хімічную прамысловасць** у адну з вядучых галін прамысловасці, поўнасцю задавальваючых патрэбнасці народнай гаспадаркі і абароны краіны. Трэцяя пяцігодка—пяцігодка хіміі».

У рашэннях з'езда асаблівая ўвага звернута на развіццё тарфяной прамысловасці, па шырокае разгортванне газіфікацыі ўсіх відаў паліва і на замену ў буйных гарадах дравянога паліва газавым.

План трэцяй пяцігодкі ставіць і перад прамысловасцю БССР велізарныя задачы: скарыстанне ў прамысловасці новых відаў мясцовай сыравіны і так званых адыходаў.

Па тэмпах свайго развіцця хімічная прамысловасць Беларусі значна адстае не толькі ад тэмпаў развіцця хімічнай прамысловасці Саюза, але таксама ад усіх астатніх галін прамысловасці БССР. Між тым сыравінныя паліўныя і энергетычныя рэсурсы і добра разгалінаваная транспартная сетка рэспублікі дазваляюць на базе прыродных багацяў—торфу, драўніны і мінеральных выкапняў—падняць у трэцяй пяцігодцы хімічную прамысловасць да ўзроўню развіцця ўсёй народнай гаспадаркі БССР.

ПЕРАПРАЦОЎКА ТАРФЯНОЙ СМАЛЫ

Да апошняга часу торф у БССР прымяняўся, галоўным чынам, у якасці энергетычнага паліва і толькі часткова газіфіцыраваўся на пяці газагенератарных устаноўках шклозаводаў.

Спальваючы каля 260 тыс. тон торфу ў год, гэтыя прадпрыемствы могуць даць да 15 тыс. тон тарфяной смалы, якая ў сваю чаргу можа быць скарыстана для атрымання раду хімічных прадуктаў: воску, парафіна, фенолаў, пека, маторнага гаручага, шпалапрапітачнага масла і інш.

Перапрацоўка тарфяной смалы для атрымання хімічных прадуктаў ужо ажыццяўляецца на радзе заводаў Саюза. У нас-жа ў Беларусі пераважная частка гэтай сыравіны спальваецца і ў значнай колькасці проста зліваецца ў аўрагі, ствараючы цэлыя возеры, небяспечныя ў пажарных адносінах і атручваючыя мясцовасць шкодным выпарваннямі.

У БССР завозіцца каля 3 тыс. тон пека для дарожнага будаўніцтва і значная колькасць шпалапрапітачнага масла. Між тым у нас ёсць усе прадпасылкі для пабудовы завода па перапрацоўцы тарфяной смалы. У першую чаргу неабходна пабудаваць завод для дыстыляцыі смалы, атрымання фенолаў, пека і шэрага парашка з падсмольнай вады і шпалапрапітачнага масла.

ГІДРОЛІЗ І ГАЗІФІКАЦЫЯ ТОРФУ

Вялікае значэнне для развіцця народнай гаспадаркі і для ўмацавання абароны нашай краіны мае вытворчасць гідроліза тарфянога ачосу (верхні, слаба разлажыўшыйся слой тарфяных балот).

Патрэбнасць у спірце, як у тэхнічнай сыравіне, а таксама як у гаручым, усё ўзрастае.

Доследы, праведзеныя на Менскім вопытным торфагідролізным заводзе, пацвярджаюць, што атрыманне спірта з торфу па кісłотнаму металу зусім рэальна і магчыма.

Па матэрыялах інстытута торфу Беларускай Акадэміі навук відаць, што ёсць пяць месцараджэнняў торфу, з якіх кожнае ў паасобку можа забяспечыць работу аднаго торфагідролізнага завода на працягу 15—20 год прадукцыйнасцю ў 300 тыс. дэкалітраў.

Велізарныя тарфяныя запасы рэспублікі з'яўляюцца добрай базай для развіцця газіфікацыі і торфахімічнай прамысловасці.

У 1937 годзе ўдзельная вага торфу ў паліўным балансе БССР складала 53,3 проц., у 1942 годзе яна складзе 70 проц., а ў паліўным снабжэнні электрастанцый—100 проц.

Ліквідуючы вынікі шкодніцтва, прадаўжаючы завяршэнне тэхнічнай рэканструкцыі, тарфяная прамысловасць павінна ў трэцім пяцігодзі забяспечыць далейшае развіццё і шырокае прымяненне метадаў газіфікацыі торфу, перапрацоўкі тарфяной смалы для атрымання раду хімічных прадуктаў, арганізацыі вытворчасці брыкетаў, пліт і т. д.

У першую чаргу неабходна скарыстаць магутныя торфамасівы паміж Быхавам і Прапойскам, якія штогод могуць даваць па 800 тыс. тон торфу. Мэтазгодна іх скарыстаць для газіфікацыі г. Магілева, які знаходзіцца на адлегласці 45—65 кілометраў ад балота. Тут справа ідзе аб тым, каб пабудаваць на базе прапойскага торфамасіва газагенератарную ўстаноўку для атрымання газа, які можа быць скарыстан для прамыслова-тэхналагічных і часткова для камунальна-бытавых патрэб. Апрача гэтага з адыходаў, атрымліваемых пры газіфікацыі торфу, можна атрымаць рад памянёных вышэй хімічных прадуктаў.

Горад Магілеў спажывае 188.500 тон торфу ў год. У 1942 годзе патрэбнасць горада ў торфе складзе каля 400 тысяч тон. Усю гэту масу паліва прыдзецца дастаўляць па чыгунцы, прычым каля палавіны ўсёй колькасці торфу—на адлегласці, прыкладна, у 148 кілометраў. Адсюль пытанне аб скарыстанні прапойскага торфамасіва набывае выключна вялікае народнагаспадарчае значэнне, як базы для шырокага развіцця газіфікацыі г. Магілева.

Асноўны напрамак у развіцці тарфяной прамысловасці ў трэцім пяцігодзі, апрача прамога скарыстання торфу як паліва ў цвёрдым выглядзе, павінен ісці ў бок газіфікацыі торфу. Гэта таксама вырашыць праблему атрымання каштоўных дэфіцытных хімічных прадуктаў.

ЛАКА-ФАРБАВАЛЬНАЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ ІЗАПЛІТ

Велізарнае будаўніцтва гарадоў, развіццё вытворчасці машын, аўтамабіляў і вагонаў, нарэшце рост лёгкай прамысловасці патрабуюць значнага павелічэння выпрацоўкі прадукцыі лакавай прамысловасці.

У Беларусі вытворчасцю лакаў займаюцца арцелі Белкалеспромсаюза імені Калініна ў г. Гомелі і «Ўперад» у г. Менску. Па плану 1939 года яны павінны выпусціць 500 тон асфальтавых лакаў.

Па свайму тэхнічнаму стану і аб'ёму арцелі не могуць задаволіць патрэбнасць БССР у гэтай прадукцыі.

Вытворчасць фарбаў у нас недастаткова развіта. Лоеўскі завод «Фарбацвет» выпускае выключна сухія земляныя фарбы нізкай якасці.

Праведзенымі разведкамі ў Мозырскім раёне знойдзены значныя запасы каляровых зямель, якія можна шырока скарыстаць для арганізацыі вытворчасці земляных фарбаў.

Своечасовым і актуальным з'яўляецца таксама пытанне аб расшырэнні ў Беларусі вытворчасці тэрмаізаляцыйных матэрыялаў на базе мясцовай сыравіны і паліва. Патрэбнасць у цеплаізаляцыйных матэрыялах к канцу трэцяй пяцігодкі складзе не менш 9.000 тон у год.

Савелітавы цэх новабеліцкага завода «Чырвоны хімік» выпускае толькі 3.000 тон цеплаізаляцыйных матэрыялаў у год.

Далейшае развіццё вытворчасці тэрмаізаляцыі ў БССР павінна базіравацца на будаўніцтве новага завода на месцы знаходжання сыравіны.

З наяўных у БССР месцараджэнняў даламіта значная частка сканцэнтравана на поўначы рэспублікі. З іх найбольш даследваны «Левая Руба» і «Вярхоўе» ў раёне Віцебска.

Па свайму хімічнаму саставу даламіты, якія змяшчаюць 43,3 проц. вуглемагніевай солі, з'яўляюцца зусім падыходзячай сыравінай для атрымання савеліта (тэрмаізаляцыйных пліт).

На базе гэтых даламітаў неабходна пабудаваць цэх для вытворчасці тэрмаізаляцыйных пліт пры вапняным заводзе ў «Левай Рубе» або «Вярхоўі» магутнасцю ў 3.000 тон у год.

Арганізацыя вытворчасці савеліта непасрэдна ля месцараджэння сыравіны, на ўчастку вапнянага завода, аслабяне новы аб'ект ад самастойнай заводскай гаспадаркі; апрача таго вапняны завод з лішкам здолее забяспечыць усю патрэбнасць савелітавага цэха ў вуглекіслане.

Даламіты таксама павінны быць скарыстаны для вытворчасці крэйды і вуглемагніевых салей. Патрэбнасці сельскай гаспадаркі ў хімічнай крэйдзе настолькі ўзраслі, што новабеліцкі завод «Чырвоны хімік» задавальняе гэты попыт толькі на 30 проц. Таму мэтазгодна прыступіць да праектавання завода па вытворчасці хімічнай крэйды і магнезіта на базе нашых даламітаў.

ВЫТВОРЧАСЦЬ СПІРТА, ФАРМАЛІНА, КАМФАРЫ

Па сістэме Беллесхімпрома працуюць у даны час 18 установак (з іх адна механізаваная) па сухой перагонцы бярозавай і інш. цвёрдых парод драўніны (135 казанаў) з прадукцыйнасцю 1400 тон чорнага парашка і 286 тон драўніннага спірту.

Па даных Беллесхімпрома, у Салагубскай дачы Лельчыцкага раёна магчыма ўстанавіць 30 казанаў на адыходах бярозавай і грабавай драўніны. Пры сухой перагонцы гэтых парод можна атрымаць каля 450 тон шэрага парашка і каля 150 тон драўніннага спірту.

Пры параўнальна невялікіх капіталаўкладаннях агульную гадавую прадукцыю шэрага і чорнага парашка можна давесці да 1850 тон, што можа служыць таксама базай для пабудовы завода ўксуснай кіслаты.

Адным з прадуктаў сухой перагонкі ліствевых парод з'яўляецца драўнінны спірт. Але заводы сухой перагонкі атрымліваюць толькі сыры драўнінны спірт, які, у сваю чаргу, падвяргаецца далейшай ачыстцы. Такі завод ёсць у Менску (промарцель «Уперад»). У 1939 годзе ён выпусціць 110 тон чыстага мецілавага спірту.

Мецілавы спірт шырока прымяняецца галоўным чынам для вырабу фармаліна. Вытворчасць яго можна лёгка арганізаваць на менскім заводзе «Уперад».

У нашых умовах зусім прыгодным для вытворчасці сінтэзіраванай камфары з'яўляецца падсочны шкіпідар. Выхад камфары з шкіпідара дасягае 63 проц. Наяўнасць у Беларусі высокасортнага шкіпідара (па плану 1939 года Новабарысаўскі завод дасць 525 тон жывічнага шкіпідара) дае магчымасць ставіць пытанне аб арганізацыі вытворчасці і сінтэтычнай камфары ў Беларусі.

СТАНОВІШЧА Ў ЧЭХА-СЛАВАКІІ

ПРАГА, 12 чэрвеня. (ТАСС). Газета «Поледні ліст» паведамляе аб закрыцці ўсіх граніц «пратэктарата Чэхія і Маравія».

ПРАГА, 12 чэрвеня. (ТАСС). Увесь пражскі друк публікуе паведамленне германскага інфармацыйнага бюро, у якім гаворыцца, што ў ноч на 10 чэрвеня ў горадзе Наход (Чэхія) адбылася сутычка паміж германскімі і чэшскімі паліцэйскімі. У часе сутычкі адзін чэшскі паліцэйскі забіт выстралам з рэвальвера.

ЛОНДАН, 12 чэрвеня. (ТАСС). Пражскі карэспандэнт газеты «Дэйлі экспрэс» перадае наступнае паведамленне аб барацьбе чэшскага народа супроць германскіх акупантаў:

«Вышаўшы з замка Градчаны ў Празе, — піша карэспандэнт, — я знайшоў у сябе ў кішэні тонкі ліст паперы, на якім былі надрукаваны на чэшскай мове вытрымкі з англійскага і французскага друку, дзе паведамлялася аб асноўных міжнародных падзеях, асабліва звязаных з барацьбой супроць фашысцкіх агрэсараў. Да гэтых паведамленняў была зроблена прыпіска:

«Калі вы лайяльны чэх, то вы павінны напісаць дзесяткі копій гэтага паведамлення і перадаць іх другім чэхам з просьбай, каб яны зрабілі тое-ж самае».

Такім чынам, адзначае карэспандэнт, чэшскае насельніцтва атрымлівае тыя весткі, якія скрываюцца ад іх германскімі акупантамі. Карэспандэнт таксама паведамляе, што на тэрыторыі Чэхіі і Маравіі дзейнічае тайная нацыянальная кароткахвалявая радыёстанцыя. Усе спробы Гестапо выявіць гэтую тайную радыёстанцыю аказаліся да гэтага часу беспаспяховымі.

Калі немцы ўступілі ў Прагу, гаворыць карэспандэнт, там знаходзілася многа германскіх палітычных эмігрантаў. Не гледзячы на тое, што граніца ахоўваецца ўзмоцненымі нарадамі германскіх войск, і не гледзячы на палінэйскае кальцо, наладжанае Гестапо вакол Прагі, вялікай частцы гэтых эмігрантаў удалося ўдачна скрыцца за граніцу. На буйных ваенных заводах, захвачаных германскімі ўладамі, чэшскія інжынеры праводзяць сістэматычны і прадуманы сабатаж. Гэтая маўклівая барацьба, гаворыць карэспандэнт, прадаўжаецца, не гледзячы на шматлікія арышты, правядзімыя Гестапо сярод чэшскіх патрыётаў.

НОТА ПОЛЬСКАГА ЎРАДА ДАНЦЫГСКАМУ СЕНАТУ

ВАРШАВА, 12 чэрвеня. (ТАСС). Як паведамлялася ўжо, у адказ на патрабаванне данцыгскага сената скараціць колькасць польскіх таможаных служачых у вольным горадзе польскі ўрад мае намер узмацніць таможаную службу ў Данцыгу.

10 чэрвеня польскі генеральны камісар у Данцыгу Хадацкі ўручыў ноту польскага ўрада прэзідэнту данцыгскага сената, у якой указваецца, што тэрыторыя Данцыга з'яўляецца таможанай тэрыторыяй Польшчы і што польскі ўрад будзе з усёй рашучасцю абараняць свае інтарэсы ў Данцыгу.

Урад Польшчы заяўляе, што паводзіны пэўных элементаў і некаторых данцыгскіх чыноўнікаў у адносінах да польскіх таможаных інспектароў носяць чыста праваканцыйны характар, разлічаны на стварэнне нездаровай атмасферы ў польска-данцыгскіх адносінах. Урад Польшчы, гаворыцца ў ноце, чакае, што данцыгскі сенат прадпрыме адпаведныя меры да забеспячэння безапаснасці польскіх інспектароў і ўмоў для выканання імі сваіх службовых функцый.

Што датычыць указанняў сената вольнага горада на нібы празмерную колькасць польскіх інспектароў, то ўрад Польшчы, наадварот, лічыць, што колькасць таможаных чыноўнікаў не адпавядае патрабаванням абстаноўкі. Польскі ўрад заяўляе, што сенат Данцыга не можа ў якой-небудзь меры абмежваць паўнамоцтвы польскіх таможаных інспектароў, паколькі гэта не адпавядае варшаўскаму дагавору ад 1921 года і польска-данцыгскаму таможанаму дагавору ад 1934 года. У выпадку, калі на гэтай падставе ўспыхне канфлікт, урад Польшчы вымушан будзе ўскласці адказнасць за яго на сенат вольнага горада.

Усякія дзеянні данцыгскай таможанай дырэкцыі, накіраваныя на самавольнае прыпыненне польскага кантролю, польскі ўрад вымушан будзе лічыць незаконнымі і нарушаючымі абавязацельствы вольнага горада. У тым выпадку, калі сенат Данцыга не будзе захоўваць таможаных асноў, польскі ўрад будзе вымушан узмацніць таможаны кантроль. Усякія прыпыненні польскай таможанай службы на тэрыторыі Данцыга могуць прымусіць польскі ўрад прыняць рашэнні, накіраваныя на забеспячэнне польскіх інтарэсаў.

У ноце, далей, указваецца, што польскі ўрад лічыць сваім абавязкам папярэдзіць сенат Данцыга, што стварэнне труднасцей у выкананні функцый польскай таможанай службы можа адбіцца на гаспадарчых інтарэсах Данцыга.

ЗАПРОСЫ Ў ПАЛАЦЕ АБШЧЫН

ЛОНДАН, 12 чэрвеня. (ТАСС). Парламенцкі намеснік міністра замежных спраў Бэтлер заявіў сёння ў палаце абшчын, што італьянскі ўрад давёў да ведама англійскага ўрада аб тым, што албанскае міністэрства замежных спраў закрываецца і таму замежныя прадстаўнікі ў Албаніі не будуць больш карыстацца дыпламатычнымі правамі. Англійскі прадстаўнік у Албаніі, дадаў Бэтлер, не будзе больш насіць тытул пасланніка, а астанецца там у якасці генеральнага консула.

Адказваючы на пытанне аб тым, ці былі раней вядомы тыя даныя аб германа-італьянскім удзеле ў іспанскай вайне, аб якіх нядаўна гаварылі Мусаліні і Гітлер у сваіх прамовах, Бэтлер заявіў, што ні германскі, ні італьянскі прадстаўнікі ў Камітэце па неўмяшанню ніколі не давалі апошняму такіх вестак. Затым Бэтлеру было задана другое пытанне: ці не ясна было, што для італьянскага ўрада палітыка неўмяшання была спачатку да канца чысцейшым фарсам? Бэтлер адказаў, што «ён не можа адказаць за італьянскі ўрад».

Выкладаючы акалічнасці, пры якіх быў забіт у Шанхаі японцамі англійскі грамадзянін Цінклер, Бэтлер указаў, што англійскі генеральны консул у Шанхаі заявіў пратэст супроць дзеянняў японскіх маракоў, закалоўшых штыкамі Цінклера і пакінуўшых яго без медыцынскай дапамогі. Адначасова, сказаў Бэтлер, прадстаўленні былі зроблены таксама англійскім паслом у Токіо. На пытанні аб тым, ці мае намер урад прыняць якія-небудзь іншыя меры, Бэтлер адказаў, што ўрад рашыў пачакаць рэзультатаў сваіх пратэстаў.

Чэмберлен заявіў у палаце абшчын, што работы па падняццю затануўшай падводнай лодкі «Тэціс» часова адкладзены ў сувязі з тым, што неабходны дадатковыя прыборы для гэтай работы і, магчыма, патрэбуецца два або тры тыдні, перш чым гэтыя прыборы можна будзе атрымаць.

ПРАВАЛ ГЕРМАНСКАЙ ПРАВАКАЦЫІ Ў КЛАДНО

ПАРЫЖ, 13 чэрвеня. (ТАСС). Атрыманыя з паінфармаваных крыніц весткі сведчаць аб тым, што забойства германскага паліцэйскага Кнітса ў горадзе Кладно (буйны цэнтр горнапрамысловага раёна ў Чэхіі) прадстаўляла сабою яўную правакацыю германскіх акупантаў. Чэшская паліцыя, знайшоўшы труп Кнітса, неадкладна запрасіла ўрача, які ўстанавіў, што забойства было зроблена пры дапамозе зброі германскага ваеннага ўзору. Па маючыхся даных, Кнітс быў забіт п'яным германскім афіцэрам у рэзультаце скандалу ў кабачку. З прычыны гэтага германскі друк вымушан зараз біць адбой і тым самым прызнае правал правакацыі.

Ваенныя дзеянні ў Кітаі

У ЦЭНТРАЛЬНЫМ КІТАІ

У цэнтральнай частцы правінцыі Хубэй японскія часці, якія прабавалі фарсіраваць раку Хань у раёне Лоханьцзы, былі адбіты.

У раёне Іочжоу (у паўночнай частцы правінцыі Хунань) кітайскія войскі перайшлі ў контрнаступленне. Цэнтр наступаючых знаходзіцца за 15 км. ад Іочжоу.

Кітайскія войскі выбілі японцаў з Сяоцзяцзі (за 6 км. ад Упіна, у правінцыі Цзянсі).

У ПАЎНОЧНЫМ КІТАІ

На фронце ў паўднёва-заходняй частцы правінцыі Шаньсі кітайскія часці 10 чэрвеня перайшлі ў контрнаступленне і ачысцілі ад праціўніка Маоцзінду і Пінлу. Японцы адступілі ў беспарадку, пакінуўшы многа забітых і ваеннага снаражэння. Японскія страты перавышаюць тут 1000 чалавек. Кітайцам дасталіся 4 гарматы, 1 мінамёт, вінтоўкі і кулямёты.

У баях у раёне горнага хрыбта Чжунцяошань японцы страцілі больш 2 тысяч чалавек.

Лічаць, што адною з прычын правалу японскага наступлення ў паўднёва-заходняй частцы правінцыі Шаньсі кітайскія часці ўкамплектаваны навабранцамі, не маючымі добрай ваеннай вывучкі. Сярод гэтых маладых японскіх салдат вельмі пашыраны антываенныя настроі.

Кітайскія часці перайшлі ў контрнаступленне і ў заходняй частцы правінцыі Шаньсі і выбілі японцаў з Чунту, Муцуня і Сяньцуня. Японскі атрад у 3 тысячы чалавек прабаваў наступаць у заходнім напрамку з Дау (на паўночны ўсход ад Лішы). Наступленне прыпынена.

У ПАЎДНЁВЫМ КІТАІ

На поўдзень ад Кантона 11 чэрвеня японцы прабавалі высадзіцца ў Кучэні (на поўдзень ад Чжуншаня). Атрад самаабароны прымусіў іх адступіць. Японцы страцілі забітымі звыш 60 чалавек.

У раёне Сіньхой атрады самаабароны выбілі японцаў з раду вёсак.

Па даных газеты «Даваньбао», за апошнія тры месяцы японцы страцілі ў правінцыі Гуандун забітымі, раненымі і памершымі ад розных хвароб звыш 20 тысяч чалавек. Апрача таго, 20 тысяч японскіх салдат адпраўлены ў Японію ў сувязі з іх «хваробным становішчам».

***

У час налёту японскай авіяцыі на Чэнду 11 чэрвеня кітайскія знішчальнікі збілі тры японскія бамбавозы.

АНГЛІЙСКАЕ ПАПЯРЭДЖАННЕ ЯПОНІІ

ЛОНДАН, 13 чэрвеня. (ТАСС). Па весткам «Ньюс кронікл» англійскаму паслу ў Токіо Крэйгі даручана папярэдзіць японскі ўрад аб небяспецы англа-японскага канфлікта ў Цянцзіне, дзе японцы арганізуюць блакаду англійскай і французскай канцэсій.

Па тэрыторыі англійскай канцэсіі ў Цянцзіне пражываюць 3 тыс. англійскіх падданых, 2 тысячы іншых чужаземцаў і 45 тысяч кітайцаў. На французскай канцэсіі, прылягаючай да англійскай, — каля 1 тыс. французаў і 60 тыс. кітайцаў.



На адкрыцці лагераў менскага ваеннага вучылішча імені М. І. Калініна. НА ЗДЫМКУ: курсанты на фізкультурным парадзе. Фото Я. Салавейчыка.

СВЯТА Ў ЛАГЕРАХ

Недалёка ад горада, у прыгожым сасонніку раскінуўся палатняны гарадок — лагеры менскага ваеннага вучылішча імені М. І. Калініна. Маладыя патрыёты радзімы, учарашнія рабочыя, калгаснікі, вучнёўская моладзь, авалоданьваюць ваенным майстэрствам, рыхтуючца стаць дастойнымі лейтэнантамі Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. У лагерах курсанты замапоўваюць набытыя зімой веды. Яны ў абстаноўцы, блізкай да баявой, абучаюцца майстэрству меткай стральбы, уменню дзейнічаць штыком, гранатай, рашаць складанейшыя тактычныя задачы.

12 чэрвеня, ва ўрачыстай абстаноўцы адбылося адкрыццё лагераў. У гэты дзень лагер ажыў з самага рання. У 9 гадзін 30 мінут у падраздзяленнях заканчваліся апошнія падрыхтаванні. У лагер на машынах пачалі з'язджацца госці — працоўныя горада. Іх ветліва прымалі камандны састаў і курсанты. У 10 гадз. 30 мін. увесь састаў вучылішча выстраіўся на стадыёне. Пачаўся мітынг.

На трыбуне камандаванне вучылішча, дэпутат Вярхоўнага Совета СССР, намеснік старшыні Соўнаркома БССР тав. Ванееў, сакратар Менгаркома КП(б)Б тав. Вінаградаў, в. а. старшыні горсовета тав. Герчыкаў і інш.

Мітынг адкрыў камісар вучылішча. Першым з прамовай выступіў начальнік вучылішча.

— Лагерны перыяд, — заявіў ён, — патрабуе вялікага напружання ў рабоце; высокія паказальнікі ў баявой вучобе не прыходзяць самі. іх трэба заваяваць упорнай працай. Наша задача — выпрацаваць з кожнага курсанта валявога камандзіра РСЧА.

Выступае нам. старшыні Соўнаркома БССР тав. Ванееў. Ён віншуе ад імя ўрада БССР курсантаў, камандны і палітычны састаў з адкрыццём лагераў. Тав. Ванееў гаворыць аб той велізарнай увазе і клопатах, якія праяўляюць партыя і ўрад да Чырвонай Арміі.

З вялікім уздымам на мітынгу было прынята прывітальнае пісьмо правадыру народаў таварышу Сталіну. Над лагерам грыміць магутнае многакратнае чырвонаармейскае «ура» ў чэсць таварыша Сталіна, у чэсць непераможнай Чырвонай Арміі.

Мітынг закончан. Перад трыбунай стройнымі радамі, чоткім парадным шагам праходзяць курсанты вучылішча, дэманстрыруючы выдатную страявую падрыхтоўку. Уперадзе — выпускная група курсантаў.

Пасля парада пачаўся агляд падраздзяленняў на лепшае выкананне чырвонаармейскай песні. Адно за другім праходзяць падраздзяленні, паказваючы майстэрства выканання масавых чырвонаармейскіх песень. Па заключэнню журы першае месца падзялілі паміж сабой падраздзяленні старшых лейтэнантаў тт. Фёдарава і Гурэева, другое месца заняло падраздзяленне старшага лейтэнанта тав. Крыжаноўскага.

На зялёным полі — фізкультурнікі. Яны спаборнічаюць па лёгкай атлетыцы. Першымі выйшлі бегуны, якія дэманстравалі свае поспехі. Пасля 100-метравай эстафеты быў дан старт кросу на 3.000 метраў. Выдатна працавала група гімнастаў пад кіраўніцтвам курсанта т. Лобікава.

Перад вачыма захапляючае відовішча. Высока ў паветра ўзляцела ракета. Дзесьці ў баку застракталі станкавыя кулямёты. Воддаль, на ўскраю лесу паяўляліся байцы. Гэта ўзмоцненая рота «чырвоных» пад камандаваннем старшага лейтэнанта т. Крыжаноўскага па сігналу ракеты пачала наступленне на абараняючагася «праціўніка». Рота развівае поспех, байцы, быстра перабягаюць, перапаўзаюць і, нарэшце, дасягаюць укрытае месца—хмызняк у лагчыне. Наперадзе, на адлегласці 150 метраў акапаўшыйся «праціўнік». Задача роты — выбіць яго. У хмызняку рота накапляе сілы для атакі.

На вачах у прысутных разгортваўся штыкавы бой. Байцы і камандзіры паказвалі лоўкасць і ўменне ўладаць штыком для нанясення вопагу сакрушальнага ўдару. «Праціўнік» быў разбіт, байцам горача апладыравалі.

Пасля ваеннай ігры на пляцоўках лагера выступалі фізкультурнікі. Вечарам сіламі артыстаў быў дан вялікі канцэрт.

Увесь дзень лікаваў лагер.

С. ЛЯСНЕЎСКІ.

ВЕЛАПРАБЕГ СОПКА ЗААЗЕРНАЯ—ЗАХОДНЯЯ ГРАНІЦА

АБЛУЧЧА, 11 чэрвеня (ТАСС). (Спец. кар. ТАСС). Учора вечарам ўдала прыбылі ў Аблучча. Працоўныя і фізкультурнікі горада аказалі нам цёплую сустрэчу. Адбыўся мітынг, на якім прысутнічала 3.000 чалавек.

Сёння стартуем на Архару.

Камандор велапрабегу А. ЦІМОХАЎ.

УРАЧЫСТАЕ АДКРЫЦЦЁ ЛАГЕРАЎ Н-скай ЧАСЦІ

З велізарным уздымам прайшло адкрыццё лагераў Н-скай часці, размешчаных у жывапісным мясцовасці за горадам. Яшчэ з раніцы сюды сабраліся прадстаўнікі партыйных, совецкіх, прафсаюзных арганізацый, шэфы—стахановцы прадпрыемстваў, інтэлігенцыя горада.

11 гадзін раніцы. На абшырнай плошчы стадыёна роўнымі радамі выстраіліся байцы, камандзіры і чалітработнікі.

Пачалося масавае святкаванне. Тут і групавыя гімнастычныя практыкаванні з вінтоўкамі, бег, прыжкі, мятанне гранат, валейбол і ваенна-спартыўныя ігры.

Асабліва яркае відовішча прадстаўляла сабой ваенная ігра «Наступленне і атака», у часе якой байцы паказалі майстэрства ў аўладанні тэхнікай рукапашнага бою.

Святкаванне скончылася вялікім канцэртам чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці.

Н-ская часць БАВА.

КАРЦІННАЯ ГАЛЕРЭЯ ІМЕНІ Ю. М. ПЭНА

ВІЦЕБСК. (Кар. «Звязды»). 12 чэрвеня ў доме, дзе жыў і працаваў выдатны мастак БССР Юрый Майсеевіч Пэн, адкрылася дзяржаўная карцінная галерэя яго імені.

На грамадскім праглядзе выстаўленых карцін прысутнічалі прадстаўнікі партыйных, совецкіх і грамадскіх арганізацый, стаханаўцы прадпрыемстваў, работнікі навукі, культуры і мастацтва.

У двух залах размешчаны 110 работ Ю. М. Пэна, якія ярка сведчаць пра багацейшую тэматыку доўгагадовай творчай дзейнасці высокаталенавітага майстра кісці.

Асаблівую ўвагу наведвальнікаў прыцягнулі карціны, адлюстроўваючыя быт яўрэйскай беднаты ў дарэволюцыйны час — «Кравец», «Часавы майстар», «Сват», «Штукатур» і іншыя. Сцены залаў таксама ўпрыгожваюць беларускія пейзажы, эцюды, аўтапартрэты.

Грамадскасць Віцебска з вялікім задавальненнем сустрэла адкрыццё карціннай галерэі імені Ю. М. Пэна. Мясцовыя мастакі і выкладчыкі мастацкага вучылішча тт. Давідаў, Мартынаў і Сумнік пад кіраўніцтвам прадстаўніка Ўсесаюзнага камітэта па справах мастацтваў тав. Вінера прарабілі вялікую работу па рэстаўрацыі карцін выдатнага мастака.

На жаль, у залах выстаўлена толькі частка работ Пэна. Гэта аб'ясняецца тым, што два паверхі будынка, у якім адкрыта галерэя, заняты прыватнымі жыхарамі.

З. ЛАРЫСАЎ.

АДКРЫЦЦЁ СТАДЫЁНА „ДЫНАМО"

Звыш пяці тысяч працоўных сталіцы БССР прышлі на спартыўнае свята, якое адбылося 12 чэрвеня ў чэсць адкрыцця пасля рэканструкцыі Менскага стадыёна «Дынамо» імені Кірава.

Ва ўрадавай ложы — сакратары ЦК КП(б)Б тт. Панамарэнка, Кальцоў і Грэкава, камандуючы войскамі Беларускай асобай ваеннай акругі т. Кавалёў, народны камісар унутраных спраў т. Цанава, сакратар абласнога камітэта КП(б)Б тав. Матвееў і інш.

Спартыўнае свята адкрылася парадам фізкультурнікаў спартыўнага таварыства «Дынамо».

Парад закончан. На старт забегу на дыстанцыю ў 100 метраў выходзяць дзяўчаты. Першаю фінішыруе на гэтай дыстанцыі вучаніца 33 школы Плісан з часам 14,6 сек. Сярод юнакоў дыстанцыю ў 100 м. праходзіць першым вучань гэтай-жа школы Глейдэрман; яго час — 12.2 сек. Выдатныя вынікі ў забегу на 1000 метраў для мужчын паказаў т. Сідарэнка (таварыства «Навука»). Гэту дыстанцыю ён прайшоў за 2 мін. 39,1 сек., устанавіўшы новы ўсебеларускі рэкорд. У забегу на дыстанцыю ў 5 тыс. метраў прымаў удзел пераможца кроса «Юманіта» тав. Іваньковіч. На гэтай дыстанцыі ён фінішыраваў за 15 мін. 24,6 сек., далёка пакінуўшы ззаду астатніх бегуноў.

Першае месца ў кіданні гранаты заняў студэнт тэхнікума фізкультуры т. Кавалёў, які кінуў гранату на адлегласць 64 метры 30 см.

У канцы спартыўнага свята адбылася сустрэча па футболу на першынства СССР паміж камандамі спартыўнага таварыства «Спартак» (Менск) і «Судостроитель» (Нікалаеў, УССР). Матч закончыўся з лікам 1 : 1.

ШОСТЫ ТЫРАЖ ВЫЙГРЫШАЎ ПА ПАЗЫЦЫ ЎМАЦАВАННЯ АБАРОНЫ СССР

КАЛІНІН, 11 чэрвеня. (ТАСС). Сёння ў будынку драматычнага тэатра пачаўся шосты тыраж выйгрышаў па пазыцыі ўмацавання абароны СССР. Разыгрываецца 280.900 выйгрышаў на агульную суму 46.088.800 рублёў.

Глядзельны зал тэатра перапоўнен. Тут дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і РСФСР, ордэнаносцы, стаханаўцы фабрык і калгасаў, байцы і камандзіры Чырвонай Арміі, совецкая інтэлігенцыя.

Тыраж прадоўжыцца два дні.

Сёння ў чэсць тыража ў горадзе праходзяць масавыя народныя гулянні.

ЗАВОДЫ БЕЛТОРФА ЗА 12 ЧЭРВЕНЯ

(Выпуск прадукцыі ў тонах)

	План	Здабыта	% плана
Асінторф	4.458	4.470	100,3
Чырвоны сцяг	848	882	104,0
Ім. Орджанікідзе	2.076	2.539	122,3
Ім. Даумана	272	161	59,2
Свабода	544	321	59,0
Лунскае	392	356	90,8
Дукора	396	415	104,8
Татарка	554	585	105,6
Радзічэва	166	выходны дзень	
Міханавічы	272	254	93,4
Усяго:	9.978	9.983	100,1

ДЗЁННІК

Сёння, у 6 гадзін 30 мінут вечара, у парку ім. Горкага (Зялёны тэатр) адбудзецца сустрэча працоўных Кагановіцкага раёна з дэпутатам Вярхоўнага Совета СССР тав. М. В. Кулагіным, прысвечаная вынікам работы III Сесіі Вярхоўнага Совета СССР.

Білеты — у РК КП(б)Б.

Сёння, у 7 гадзін вечара, у вялікай зале Дома партактыва, аддзел прапаганды і агітацыі Менгаркома КП(б)Б праводзіць даклад аб міжнародным становішчы.

Дакладчык М. С. Драгілеў.

В. а. адказнага рэдактара Д. Т. ЛЕБЕДЗЕЎ.

УПРАЎЛЕННЕ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР
(Памяшканне Дзяржаўнага Яўрэйскага тэатра БССР)

ЛЕНІНГРАДСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР імені Ленінградскага Совета
Мастацкі кіраўнік—засл. арт. ордэнаносец С. Е. Радлоў.
17 і 18 чэрвеня К. Фінн і М. Гус

„КЛЮЧИ БЕРЛИНА"

Пачатак у 8 г. веч. Каса адкрыта з 11 да 2 і з 6 да 9 г. вечара.

Гастролі Дзяржаўнага Рускага тэатра музыкальнай камедыі БССР (Памяшк. Дзяржаўнага Яўрэйск. тэатра БССР)
14 чэрвеня
«РОЗ МАРИ»
Пачатак у 8 г. веч. Білеты ў касе тэатра з 11—2 і з 5 г. веч.

ДЗЯРЖЦЫРК
СЁННЯ і ШТОДЗЕННА ГАСТРОЛІ буйнейшага атракцыёна
КІТАЙСКІ НАРОДНЫ ЦЫРК
20 ВАН-Ю-ЛІ 20
Удзельнічае ўся трупа.
Пачатак у 9 гадзін вечара.

Кінотэатр «Родина» ШЮЗ САЛДАТ З ФРОНТА
Кінотэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» ЧАЛАВЕК У ФУТЛЯРЫ
Кінотэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» ТАНКІСТЫ
Кінотэатр «Парыжская Комуна» (Пушкіна, 64) ЦЫРК
Кінотэатр «СПАРТАК» «ОСТРОВ СОКРОВИЩ»
Дзіцячы кінотэатр «ПОБЕДА»
Кінотэатр «НАВІНЫ ДНЯ»
1. Кітай у барацьбе.
2. Журнал Менскай студыі кінохронікі № 28.
3. Чырвонаармейскія таленты (кінонарыс)

Беларускае аддзяленне „СОЮЗКИНОПРОКАТ"
гэтымі днямі выпускае на экраны рэспублікі
НОВЫ МАСТАЦКІ АБАРОННЫ ФІЛЬМ

„ЭСКАДРЫЛЛЯ № 5"

Фільм паказвае гераізм, адвагу і мужнасць совецкіх лётчыкаў, байцоў і камандзіраў непераможнай Чырвонай Арміі. Нашы часці паспяхова разбіваюць праціўніка на яго-ж тэрыторыі ў першыя часы будучай вайны, якую фашысты навязваюць Совецкаму Саюзу.

Вытворчасць Кіеўскай кінастудыі.

Сцэнарый І. Прута.
Рэжысёр А. Роом.
Галоўны аператар Н. Топчый.
Кампазітар Н. Данькевіч.
Тэкст песні паэта-ордэнаносца В. Лебедзева-Кумача.

У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ:

Н. ГАРЫН, ордэнаносец Б. БЕЗГІН, О. АЛЬТОЎСКАЯ, заслужаны дзеяч мастацтваў В. ШУМСКІ.

МЕНСКАЯ КАНТОРА ГАЛОЎМЕТАЛАЗБЫТА
ПАВЕДАМЛЯЕ, ШТО
з 15 чэрвеня г. г. АДКРЫВАЕЦЦА
СКЛАД РОЗНІЧНАГА ГАНДЛЮ
МЕТАЛАМ

ПРОДАЖ ПРАВОДЗІЦЦА КАЛГАСАМ, СОЎГАСАМ, ДАМАМ СОЦЗАБЕСПЯЧЭННЯ, ДЗІЦЯЧЫМ САДАМ І ЯСЛЯМ, ДОМАЎПРАЎЛЕННЯМ, ШКОЛАМ, РАЙМАГАМ, СЕЛЬМАГАМ І ПРАДПРЫЕМСТВАМ па адпаведных патрабаваннях.

Індывідуальным спажыўцам для іх уласных гаспадарчых патрэб па даведках, завераных сельсоветам, калгасам або домаўпраўленням.

ПРОДАЖ ПРАВОДЗІЦЦА ЗА НАЯЎНЫ РАЗЛІК.

АДРАС СКЛАДА: МЕНСК, НІЗАВАЯ ВУЛІЦА, СКЛАД РОЗНІЧНАГА ГАНДЛЮ ГАЛОЎМЕТАЛАЗБЫТА.

ГАЛОЎМЕТАЛАЗБЫТ.

У МЭТАХ ВЫЯЎЛЕННЯ ЛЕПШЫХ НАРОДНЫХ І ПРАФЕСІЯНАЛЬНЫХ ВЫКАНАЎЦАЎ БЕЛАРУСКІХ ЛІТАРАТУРНЫХ І МУЗЫКАЛЬНЫХ ТВОРАЎ
УПРАЎЛЕННЕ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР
АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС

НА ВЫКАНАННЕ НАРОДНЫХ БЕЛАРУСКІХ ПЕСЕНЬ, ЧАСТУШАК, КАЗАК, БЫЛІН, МУЗЫКАЛЬНЫХ ТВОРАЎ совецкіх беларускіх кампазітараў, беларускіх совецкіх паэтаў і пісьменнікаў.

Конкурс праводзіцца ў канцы жніўня і пачатку верасня трыма турамі: першы тур адбудзецца на месцах у абласных гарадах: Менску, Віцебску, Гомелі, Магілеве і Мазыры, другі і трэці туры праводзяцца ў Менску.

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца выканаўцы-прафесіяналы, удзельнікі і кіраўнікі гурткоў мастацкай самадзейнасці, а таксама студэнты музыкальных і тэатральных вучылішч, студый, курсаў і кансерваторыі: інструментальныя і вакальныя ансамблі (дуэты, трыо, квартэты), салісты-інструменталісты, салісты-вакалісты, выканаўцы народных песень, частушак, чцяцы, былінні, сказіцелі і расказчыкі.

Для прафесіяналаў-выканаўцаў патрабуецца выкананне 5 твораў арыгінальных, народных і класічных, сярод якіх не менш аднаго на совецкую тэматыку.

Для выканаўцаў — удзельнікаў мастацкай самадзейнасці — выкананне 3-х твораў народных або совецкіх аўтараў.

Для заахвочвання ўдзельнікаў конкурса УСТАНОЎЛЕНА 12 ГРАШОВЫХ ПРЭМІЙ:

4 першых прэміі па 2.000 р., 4 другіх прэміі па 1.000 р., 4 трэціх прэміі па 500 р. і пачотныя дыпломы.

Заявы аб удзеле ў конкурсе накіроўваюцца ў абласныя аддзелы мастацтваў сваёй вобласці ДА 1 ліпеня г. г. Там-жа можна даведацца аб усіх падрабязнасцях умоў конкурса.

УПРАЎЛЕННЕ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР.

УПРАЎЛЕННЕ СЯЦЕЙ І ПАДСТАНЦЫЙ гор. МЕНСКА
ПРАПАНУЕ ЎСІМ ПРАДПРЫЕМСТВАМ І ЎСТАНОВАМ,
не атрымаўшым да гэтага часу залога
ў забеспячэнне платы за карыстанне электраэнергіяй.
ЯКІ ПАДЛЯГАЕ ЗВАРОТУ, згодна пастановы СНК БССР,
ПАКЛАПАЦЦЦА АТРЫМАННЕМ ЯГО ДА 1 ЖНІЎНЯ Г. Г., прадставіўшы ў бухгалтэрыю УСП залоговыя квітанцыі.
Пасля гэтага тэрміна прэтэнзіі прымацца не будуць.

Уп. Галоўлітбела № Т—1309. Менск, друкарня «Звязды», Совецкая, 49. К., Л., Ш.